Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

Літаратура і мастацтва

ISSN 0024-4686

№ 11 (4966) 23 сакавіка 2018 г.

Натхнёныя радзімай Бачылы 6

Незабыўныя сустрэчы з Быкавым 10

АдмыСлова пра мову 11

Жаночы космас Алены Шлегель 12

Тонкае мысленне рэжысёра 14

Памяць скрозь стагоддзе

Вялікая Айчынная вайна пакінула беларускаму народу цяжкую спадчыну — памяць пра трагедыі людзей, якія сталі сведкамі і ахвярамі жудасных злачынстваў фашызму. Сёння мы аддаём даніну памяці жыхарам Хатыні, спаленай нацыстамі 75 гадоў таму.

22 сакавіка 1943 года ў жыццё маленькай вёсачкі прыйшла бяда. Акупанты, цярпячы паражэнне на франтах, вынеслі смяротны прысуд мірнаму насельніцтву. Карнікі не пашкадавалі старых, жанчын і немаўлят. У агні загінула 149 чалавек.

Мы ніколі не змірымся з жахам бацькоў, на вачах якіх паміралі дзеці. Нам ніколі не забыць страх і бездапаможнасць дзіцяці, якое шукае абароны ў дарослага і не разумее, за што адбіраюць яго жыццё. Нам не дараваць смутку бацькі, які выжыў, але страціў свайго сына, і слёз хлопчыка, які знайшоў выратаванне пад целам забітай маці.

Калі мы думаем аб Хатыні, то ўспамінаем тысячы па-зверску знішчаных вёсак. Аплакваючы ахвяр гэтых жудасных падзей, аплакваем кожнага трэцяга жыхара Беларусі, які загінуў падчас Другой сусветнай вайны. Гэты боль назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах як памяць пра жорсткія злачынствы супраць чалавечнасці. І няма ім апраўдання.

Занадта дарагой цаной дасталася свабода роднай зямлі нашаму народу. Гістарычную памяць пра тыя страшныя гады мы беражліва захаваем і перададзім дзецям як імунітэт супраць любой ваеннай агрэсіі і нацыяналістычнай варожасці. Як разуменне таго, што нічога ў свеце не вартае адабранага чалавечага жыцця.

Свет зноў забывае гэтыя ўрокі. Ваенныя пагрозы, тэрарыстычныя атакі, міжканфесійныя сваркі і міжнацыянальныя канфлікты запаўняюць старонкі гісторыі XXI стагоддзя новымі незлічонымі ахвярамі. І сучасны твар зла, часам схаваны за маскай добрых намераў, — такі ж выродлівы, як і ў нацызму. Ідэі звышдзяржаўнасці і перавагі нацый знаходзяць чарговых паслядоўнікаў і вядуць да новых бед.

Мы, беларусы, носьбіты геннай памяці нечалавечых пакут народа, што выстаяў у Вялікай Айчыннай вайне, кажам усім: «Хай журботны стогн звяноў Хатыні гучыць і перасцерагае ад паўтарэння страшнай трагедыі. Няхай іх металічны плач даносіцца да тых куткоў Зямлі, дзе сёння забылі аб тым, што жыццё — гэта дар звыш, мір — самая вялікая каштоўнасць.

Мы павінны гэта памятаць заўсёды!»

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка
22 сакавіка 2018 года

Фота Кастуся Дробава.

Фота Кастуся Дробава.

Каштоўнасць вялікую маем — уласную дзяржаву. І хто кажа, што не адпакутавалі за яе? Тое, што выношвалася ў марах стагоддзямі і выспявала — ад Полацкага княства, збірання народа ў Вялікім княстве да ўсведамлення патрэбы «людзьмі звацца», — прарасло ў рэчаіснасці і расквітнела абрысамі кветкі на карце. І нават той момант, калі толькі прабіўся праз узараную глебу парастак, быў часам вялікіх выпрабаванняў, што патрабаваў ад людзей і самаахвярнасці, і цярплівасці, і моцнай волі давесці справу да ўвасаблення ў правобразе дзяржаўнасці ў інтарэсах беларускага народа. І фактычна ўсё мінулае стагоддзе прайшло з думкай пра яе: з пакутамі і ахвярамі тых, хто гатовы быў адстойваць сваю зямлю, і рашучасцю тых, хто гатовы быў падхопліваць справу папярэдніх пакаленняў. Вядома: акрэсленая, выразна сфармуляваная ідэя — падмурак для далейшых дзеянняў. Яе выпеставалі цягам стагоддзя. Адстаялі ў ваенным ліхалецці, заплацілі за яе вялікай крывёй. Прыйшоў час — дэкларавалі, засведчылі перад усім светам: ёсць незалежная Рэспубліка Беларусь. Каб гэтая каштоўнасць свяціла ўсімі сваімі гранямі, патрэбнае разуменне, як паўставала кожная з іх.

Акцэнты тыдня:

краіна

Выбары ў Расіі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Уладзіміра Пуціна з пераканаўчай перамогай на выбарах Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. «Гэты вынік сведчыць аб высокім даверы і падтрымцы грамадзянамі Расіі ўзятага курсу на ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны, умацаванне яе аўтарытэту на міжнароднай арэне. Упэўнены, што гістарычныя вузы дружбы і ўзаемаразумення нашых народаў стануць залогам далейшага пашырэння беларуска-расійскага стратэгічнага партнёрства», — гаворыцца ў віншаванні.

Плённая размова. Прэзідэнт Беларусі правёў сустрэчу з творчай моладдзю, у якой узялі ўдзел амаль 270 чалавек. Гэта студэнты рэспубліканскіх і рэгіянальных устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, прадстаўнікі вядучых творчых калектываў і маладыя творчыя работнікі. На сустрэчу з кіраўніком дзяржавы былі запрошаны і педагогі, вучні якіх не раз станавіліся лаўрэатамі міжнародных конкурсаў, паспяхова займаюцца творчай і педагагічнай дзейнасцю ў сферы культуры.

Год малой радзімы. Міністэрствам інфармацыі Беларусі распрацаваны план па інфармацыйным суправаджэнні правядзення ў 2018 Года малой радзімы. Дзяржаўныя СМІ возьмуць актыўны ўдзел у яго рэалізацыі. Рыхтуюцца новыя тэматычныя рубрыкі ў друкаваных СМІ, выпуск спецыяльных публікацый і відэасюжэтаў на рэспубліканскіх і рэгіянальных тэлерадыёканалах. Спецыяльныя праекты, прысвечаныя Году малой радзімы, у прыватнасці, запланаваны Выдавецкім домам «Звязда» сумесна з Брэсцкім аблвыканкамам — «Вескі, якія знікаюць: апошнія жыхары», з грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь» — «Край, дзе я жыву», з Магілёўскім аблвыканкамам — «Месца дзеяння» і «Вандроўка патрыётаў».

Праваслаўная кніга. Народ Беларусі робіць усё для падтрымання згоды і ўзаемаразумення ў сваёй краіне. Такую думку выказаў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі падчас святкавання Дня праваслаўнай кнігі ў Духоўна-адукацыйным цэнтры ў Мінску. Уладыка адзначыў, што Беларусь мае багатую духоўную культуру, папулярызацыі і развіцці якой садзейнічае ў тым ліку правядзенне дзён праваслаўнай кнігі. Падобныя мерапрыемствы на працягу сакавіка ладзяцца ва ўсіх епархіях Беларускага экзархата, у публічных і царкоўных бібліятэках, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, а таксама ў духоўных школах БПЦ.

Спадчына. Міністэрствам культуры падчас нядаўняй калегіі прынята рашэнне аб неабходнасці распрацоўкі падыходаў па стымуляванні ўдзелу фізічных і юрыдычных асоб у рэстаўрацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама захаванні аб'ектаў нематэрыяльнай спадчыны. У Мінкультуры лічаць, што мясцовыя органы ўлады, ведаючы сітуацыю знутры, могуць унесці прапановы, якім чынам стымуляваць інтарэс уласнікаў аб'ектаў, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Магчыма, гэта могуць быць пэўныя фінансавыя паслабленні.

Тым часам у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прэзентаваная серыя «Нарысы гісторыі культуры Беларусі» у чатырох тамах. Фундаментальнае выданне, у якім адлюстраваная гісторыя культуры Беларусі ад Сярэднявечча да нашых дзён, стала вынікам шматгадовай працы навукоўцаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН. Вынікі навуковай працы будуць асновай для навуковага суправаджэння дзяржаўнай палітыкі развіцця нацыянальнай культуры, для фарміравання і ўдасканалення вучэбных праграм вышэйшых навучальных устаноў творчага і культуралагічнага кірункаў.

Стасункі. I Міжнародны форум духавога мастацтва «Фанфары Наднямоння» адбыўся ў Стоўбцах, паведамілі ў Мінаблвыканкаме. Мэта — папулярызацыя духавой музыкі, падтрымка канцэртнай дзейнасці айчынных і замежных калектываў і выканаўцаў духавой музыкі. У межах форуму ладзілася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Праблемы развіцця духавога мастацтва Беларусі і замежных краін: гісторыя, тэорыя, арганізацыйна-творчыя аспекты».

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Прэміі — сталічным пісьменнікам

У Доме дружбы і Літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа прайшлі ўрачыстыя цырымоніі ўручэння літаратурных прэмій Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі па выніках публікацый за 2017 год.

Фота Міхаіла Крыжаноўскага.

Падчас уручэння прэмій.

Літаратурнай прэміяй імя Івана Шамякіна ўганаравана празаік Наталля Касцючэнка за раман «Час жніва і час пакаяння». У жанры паэзіі прэмія імя Максіма Танка ўручана Уладзіміру Шуглю за кнігу лірыкі «Імя тваё».

Гэтыя прэміі прысуджаліся ўпершыню. А вось юных літаратараў прэміяй «Адкрыццё года» сталічнае аддзяленне СПБ адзначае з 2013 года. Лаўрэатамі былі Людміла Клачко, Яўгенія Руль, Дзмітрый Саўчык, Таццяна Купрыянец, Кацярына Роўда, Кацярына Стройлава.

Цяпер на высокую ўзнагароду прэтэндавалі 12 творцаў. Па рашэнні экспертнага савета па прысуджэнні літаратурнай прэміі МГА СПБ «Адкрыццё года», лаўрэатамі за мінулы год сталі Настасся Каротчыкава (за кнігу вершаў «До мінор») і Валерыя Ісаковіч (за кнігу вершаў «Ля падножжа паветранага замка»). Абодва выданні ўбачылі свет у кніжнай серыі сталічнай пісьменніцкай арганізацыі «Мінскія маладыя галасы».

Міхась ПАЗНЯКОЎ

Стасункі

РУМЫНСКАЯ ПРАЛЕСКА

У Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага прайшла літаратурна-музычная вечарына «Румынскія старонкі». Падчас імпрэзы адбылося падпісанне двухбаковай Дамовы аб супрацоўніцтве паміж Пасольствам Румыніі ў Рэспубліцы Беларусь і Музеем гісторыі горада Мінска, а таксама Музеем Марка Шагала ў Віцебску.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Румыніі ў Беларусі Віярэл Машану заўважыў, што сёлета на яго радзіме адзначаюць стагоддзе аб'яднання румынскай нацыі ў адзіную дзяржаву, а таксама традыцыйнае вясенняе свята Мэрцішор, якое ў мінулым годзе ўвайшло ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

Рэдакцыя старэйшага літаратурна-мастацкага часопіса Беларусі «Полымя» прэзентавала нумар, прысвечаны румынскай літаратуры. Галоўны рэдактар выдання Алена Мальчэўская параўнала тэматычны нумар з пралескай: можна спадзявацца, што гэта толькі першая кветка на шляху супрацоўніцтва дзвюх літаратур. Наведвальнікі імпрэзы пазнаёміліся з перакладамі на беларускую мову класічных і сучасных румынскіх аўтараў. Паэтка і перакладчыца Юлія Алейчанка прачытала беларускамоўны ўрывак з паэмы «Лучафэрул» вядомага паэта Міхая Эмінэску, а акцёр Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Дзмітрый Давідовіч выступіў з вершам «Чаму мы кахаем жанчыну?» Мірчы Кэртэрэску ў перакладзе Веранікі Бандаровіч. Выкладчыкі і навучэнцы Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М. І. Глінкі выканалі творы Джорджа Энэску, Ціберыва Брэдзічану, Канстанціна Думітрэску, Грыгараша Дзініку. Жывапіс прадставілі карціны першага намесніка старшыні Беларускага саюза мастакоў Глеба Отчыка, якія мастак стварыў падчас вандроўкі па Румыніі.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

24 сакавіка *— на паэтычны канцэрт Ганны Мартынчык у Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» (а 15.00).*

27 сакавіка *— у Школу юнага паэта пры Мінскім гарадскім аддзяленні СПБ (а 14.00).*

28 сакавіка *— на сустрэчу з Валерыем Квілорыя ў публічную бібліятэку № 13 (аб 11.30).*

28 сакавіка *— на літаратурна-музычную імпрэзу «Апякункі паэтычных нябёсаў» з удзелам пісьменнікаў у публічную бібліятэку № 14 імя Ф. Багушэвіча (а 15.00).*

28 сакавіка *— у беларуска-турэцкі літаратурны клуб «Дыялог сяброў» на імпрэзу з удзелам пісьменнікаў сталічнага аддзялення ў офіс турэцкай грамадскай арганізацыі «Разам крок» па вул. Крапоткіна, 89, 4 паверх (а 14.30).*

29 сакавіка *— на прэзентацыю часопіса «Берега» (г. Калінінград) з удзелам галоўнага рэдактара Лідзіі Давыдзенкі і беларускіх аўтараў выдання ў публічную бібліятэку № 4 (а 16.00).*

Мінскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

23 сакавіка *— на сустрэчу Ірыны Карнаухавай з вучнямі ў бібліятэку Мачулішчанскага цэнтра культуры і вольнага часу (а 14.00).*

27 сакавіка *— на пасяджэнне вочна-завочнай школы «Са-Творчасць» для творчай моладзі пры Мінскім абласным аддзяленні СПБ (секцыя «Проза») (плошча Свабоды, 13, актавая зала) (аб 11.00).*

29 сакавіка *— на імпрэзу Віктара Кажуры «Мой родны кут» у вілейскую цэнтральную бібліятэку (а 10.30).*

29 сакавіка *— на пасяджэнне вочна-завочнай школы «Са-Творчасць» для творчай моладзі пры Мінскім абласным аддзяленні СПБ (секцыя «Паэзія») (плошча Свабоды, 13, актавая зала) (аб 11.00).*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

27 сакавіка *— на сустрэчу з протадыяканам Андрэем Гарбуновым і прэзентацыю яго кнігі «История православных храмов г. Барановичи» ў Брэсцкую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А. С. Пушкіна (а 16.00).*

28 сакавіка *— на пасяджэнне літаратурнага клуба «Адкрыццё» ў Брэсцкую цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А. С. Пушкіна (а 17.00).*

29 сакавіка *— на літаратурную віктарыну для дзяцей «Літаратурная Брэстчына» ў СШ № 29 (а 10.00).*

30 сакавіка *— на пасяджэнне літаратурнага клуба «Пінчукі» ў пінскую раённую бібліятэку імя Я. Янішчыц (а 17.00).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

27 сакавіка *— на юбілейную творчую сустрэчу з Аленай Крыклівец у Віцебскую абласную бібліятэку імя У. І. Леніна (а 17.30).*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

27 сакавіка *— на сустрэчу з Віктарам Праўдзіным у Гродзенскую абласную навуковую бібліятэку імя Я. Карскага (а 15.00).*

28 сакавіка *— на чарговае пасяджэнне грамадскага дыскусійнага клуба «Словадром» у Гродзенскую абласную навуковую бібліятэку імя Я. Карскага (а 17.00).*

29 сакавіка *— на сустрэчу школьнікаў з Ганнай Скаржынскай-Савіцкай у межах Тыдня дзіцячай кнігі ў СШ № 34 г. Гродна (аб 11.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

25 сакавіка *— на літаратурную сустрэчу Алены Кісель і Марыны Сліўко з маладымі аўтарамі, выхаванцамі студыі «Азбука вершаскладання», у Магілёўскую абласную бібліятэку імя У. І. Леніна (аб 11.00).*

27 сакавіка *— на літаратурную гадзіну «Падарожнічай, чытай, свет пазнавай!», якую ў межах Тыдня дзіцячай кнігі правядзе Мікола Леўчанка сумесна з бібліятэкай-філіялам № 50 мікрараёна Колас у СШ № 2 г. Быхава (а 10.30).*

29 сакавіка *— на літаратурны вечар-партрэт Марыны Сліўко і прэзентацыю яе кнігі «Пилигримы Вселенной» у санаторый «Дубравенка» Магілёўскага раёна (а 17.30).*

Фестываль

МУЗЫЧНЫ КРАСАВІК

Свята аркестра, стваральнік рок-оперы ды Якуб Колас

«Мінская вясна» сёлета, напэўна, супадзе з каляндарнай — па красавіцкай свежасці ды насычанасці, па цеплыні і, безумоўна, па гучанні. Сёлетні цыкл вясновых канцэртаў у філармоніі абяцае пазнаёміць аўдыторыю з сімфанічнай, камернай, харавой, фартэпіяннай і фальклорнай музыкай, а таксама прадставіць доўгачаканую прэм'еру харавога тэатра. «Мінская вясна» пройдзе ў красавіку ў сталіцы 34-ы раз і зноў аб'яднае музыкантаў з некалькіх краін.

Нязменным пачаткам форуму стане канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра з дырыжорам Уладзімірам Вярбіцкім. У якасці саліста — кітайскі піяніст Джэ Юэн, які скончыў вядомую амерыканскую мастацкую школу Джуліярд. Вясновую атмасферу будуць ствараць шэдэўрамі рускай класікі — творамі Чайкоўскага ды Шастаковіча.

Яшчэ ў лістападзе чакалася прэм'ера «Плошчы Якуба Коласа» — музычнага спектакля Ларысы Сімаковіч, якую сама кампазітар назвала «метафарай XXI стагоддзя». Гэтая ўнікальная пастаноўка прысвечана 135-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа, таму спектакль будзе ўрачысты: з драмай, пластыкай, эксперыментальнай музыкай і маштабнымі харавымі сцэнамі. У пастаноўцы выкарыстаюць музыку Баха, Пёрсэла, Вайтакра і Лаўрыдсана.

Працягнецца «вясна» канцэртам фартэпіяннай музыкі — ужо сталая традыцыя фестывалю. Выступяць піяністы Юрый Бліноў і Соф'я Гуляк (выканаюць творы Баха, Клеменці, Шуберта, Шапэна, Дэбюсі, Скрабіна ды іншых). Фартэпіянную тэму працягнуць музыканты з Італіі Паола Жэрардзі і Рафаэле Трывізані. Плануецца і вечар фартэпіяннай музыкі, падчас якога Камерны аркестр выступіць разам з таленавітымі дзецьмі з Беларусі і Расіі. Для аматараў панавання інструментаў зладзяць «Фестываль аркестравых музыкантаў» (можна будзе пачуць, напрыклад, «Палёт чмяля», выкананы на тубе!), дзе збяруцца беларускія музыканты, якія жывуць у Францыі, Ізраілі, Амерыцы…

Адна з самых значных традыцый «Мінскай вясны» — творчыя вечары. Першы савецкі музыкант, які папулярызаваў у нашай мясцовасці мюзіклы (ды напісаў першую расійскую рок-оперу «Арфей і Эўрыдыка»), Аляксандр Журбін выступіць у філарманічнай зале з прэм'ерай новага твора: вечар пачнецца з сімфоніі, працягнецца канцэртам для цымбалаў і сімфанічнага аркестра і фрагментамі з мюзіклаў, песень і рамансаў у выкананні Аксаны Волкавай, Уладзіміра Пятрова, Наталлі Гайды ды жонкі кампазітара Ірыны Гінзбург.

Яшчэ адна прыемная падзея — юбілейны вечар мастацкага кіраўніка камернага аркестра Яўгена Бушкова, які адсвяткаваў свой 50-гадовы юбілей. Падчас канцэрта Бушкоў збіраецца выступіць разам з сябрамі: маскоўскі кампазітар Яфрэм Падгайцын адмыслова для гэтага напісаў новыя творы, тое ж самае зрабіла і Галіна Гарэлава. Бушкоў адзначае, што разам з юбілеем (уласным ды аркестравым) хоча адсвяткаваць і юбілей аднаго з твораў Вайнберга, які абяцае выканаць падчас творчага вечара. Заснавальнік «Мінскай вясны» мастацкі кіраўнік філармоніі Юрый Гільдзюк адсвяткуе дзень нараджэння 15 мая. Канцэрт будзе называцца «Мае сябры: настаўнікі і вучні», і праграма цалкам адпавядае назве. Падчас вечара выступяць піяністы Андрэй Паначэўны, Андрэй Сікорскі, Аляксандр Данілаў, арганіст Іаганес Геферт, Мінскі струнны квартэт ды іншыя музыканты. Завершыцца «Мінская вясна» 19 мая канцэртам фартэпіяннай музыкі, якая так палюбілася айчыннай публіцы: у вялікай філарманічнай зале выступяць нашы таленавітыя суайчыннікі Андрэй Паначэўны і Кірыл Кедук.

Маргарыта ДЗЯХЦЯР

Святло рампы

Запрашальнік у закуліссе

Тыдзень тэатра, прымеркаваны да Міжнароднага дня тэатра (27 сакавіка), пройдзе ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы з 27 сакавіка па 1 красавіка.

Фота з архіву Купалаўскага тэатра.

Мастацкі кіраўнік Купалаўскага тэатра Мікалай Пінігін.

Кожны, хто загадзя зарэгіструецца і прад'явіць на ўваходзе квіток на любы спектакль з рэпертуару Купалаўскага ў красавіку, можа наведаць праграму культурна-адукацыйных мерапрыемстваў, каб атрымаць новы досвед у мастацтве Мельпамены. Першы дзень свята распачнецца з фотавыстаўкі, якая адкрыецца на камернай сцэне. Малады акцёр Купалаўскага тэатра Максім Карасцялёў на працягу двух гадоў фіксаваў нефармальнае жыццё артыстаў: рэжысёр Мікалай Пінігін паказаны ў сваёй дамашняй майстэрні, акцёры Зінаіда Зубкова і Павел Харланчук шукаюць грыбы, а Раман Падаляка і Міхаіл Зуй задзейнічаны ў працэсе стварэння фільма «Ягор». На плёнцы Максіма Карасцялёва захаваліся і апошнія здымкі народнага артыста Генадзя Гарбука.

28 сакавіка да Тыдня тэатра далучыцца мастацкі кіраўнік Купалаўскага Мікалай Пінігін. Ён расскажа аб прынцыпах адбору твораў для пастаноўкі на сцэне і фарміраванні рэпертуару, а таксама пра галоўныя спектаклі ў сваёй творчасці. На наступны дзень пройдзе лекцыя ад аднаго з заснавальнікаў праекта «Культурны тэхнікум» Мікіты Моніча «Як глядзець спектакль: некрытычныя парады». 30 сакавіка абмяркуюць повязі паміж тэатрам і літаратурай. Да ўдзелу ў дыскусіі запрошаныя рэжысёры Купалаўскага тэатра Раман Падаляка («Радзіва "Прудок"») і Алена Ганум («Шабаны»), а таксама аўтар рамана «Шабаны. Гісторыя аднаго знікнення» пісьменнік Альгерд Бахарэвіч. Абавязкі мадэратара размовы возьме Алена Мальчэўская, тэатральны крытык, журналіст, галоўны рэдактар літаратурна-мастацкага часопіса «Полымя».

У апошні дзень тэатральнага тыдня наведнікі зазірнуць туды, куды раней не мог патрапіць звычайны глядач: ім прадставяць бутафорскі цэх і грымёрку, сцэну і закуліссе. Падчас экскурсіі госці ўбачаць, дзе нараджаецца пастаноўка, даведаюцца пра гісторыю тэатра і яго візітоўку — спектакль «Паўлінка», прагледзяць старыя афішы, а таксама выйдуць на сцэну з рэплікамі і зробяць фота ў дэкарацыях.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

ЛіМ КАЛЯНДАР

23 сакавіка 80-годдзе адзначае Фама Варанецкі, акцёр, педагог, заслужаны артыст БССР.

23 сакавіка 70-гадовы юбілей святкуе Генадзь Пашкоў, паэт, публіцыст, перакладчык.

24 сакавіка — 110 гадоў з дня нараджэння Аляксея Глебава (1908—1968), скульптара, народнага мастака Беларусі.

24 сакавіка 85 гадоў святкуе Канстанцін Лосеў, беларускі і расійскі спявак, заслужаны артыст БССР.

25 сакавіка — 105 гадоў з дня нараджэння Любові Цімашковай (1913—1978), літаратуразнаўца, крытыка.

25 сакавіка — 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Мехава (сапр. Няхамкін; 1928—2017), празаіка, журналіста.

26 сакавіка — 80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Маскоўскіх (1938—2002), жывапісца.

27 сакавіка — 125 гадоў з дня нараджэння Натана Грубіна (1893—1945), дырыжора і педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

27 сакавіка — 95 гадоў з дня нараджэння Алеся Рылько (1923—1967), празаіка, драматурга, публіцыста.

28 сакавіка — 135 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Керзіна (1883—1979), скульптара, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

28 сакавіка 80 гадоў спаўняецца Святлане Каробкінай, паэтэсе.

28 сакавіка — 80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Раговіча (1938—2005), харавога дырыжора, фалькларыста, педагога.

28 сакавіка 70 гадоў адзначыць Аляксандр Цыркуноў, жывапісец.

Люстэрка тыдня:

свет

Міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне — 2018» пройдзе ў Мінску 25 лістапада ў спартыўна-забаўляльным комплексе «Мінск-Арэна». Гэтая пляцоўка ўжо прымала міжнародны тэлевізійны праект у 2010 годзе і адпавядае ўсім патрабаванням назіральнага савета «Еўрабачання». Сімволіку 16-га дзіцячага шоу Еўрапейскі вяшчальны саюз вызначыў з дапамогай адкрытага конкурсу: лепшую работу прадставіў дызайнер Максім Букас. Яго лагатып «Зорка», выкананы на манер вышыванкі з вертыкальных гукавых хваль, у суправаджэнні слогана «*Light up!*» («Запальвай!») хутка з'явіцца на білбордах сталіцы.

Вынікі Міжнародных майстар-класаў іканапісу, якія традыцыйна ладзяцца ў польскім горадзе Навіца, можна ўбачыць у мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (Палац Рэспублікі). Сёння адкрыецца выстаўка «Абожанае цела», дзе прадставяць работы больш як 40 мастакоў з Польшчы, Украіны, Беларусі і нават Румыніі. На чарговым вераснёвым пленэры, які прайшоў у Навіцы дзявяты раз, творцы звярнуліся да тэмы старазапаветнага грэхападзення чалавека, прайшлі праз паказ цела, ахвяры і ўваскрашэння Хрыста да таямніцы аб'яднання боскага і чалавечага.

Пачынаюцца Дні карэйскага кіно ў Мінску: да 25 сакавіка ў Малой зале Палаца Рэспублікі гледачу прадставяць кінастужкі розных жанраў, а таксама выстаўку паўднёвакарэйскіх пейзажаў. З 3 па 8 красавіка ў кінатэатры «Піянер» пройдзе рэтраспектыва «Змяркане і прыгажосць: Новая класіка японскага кіно», дзе пакажуць шэсць фільмаў ад вядучых рэжысёраў Японіі. Рэжысёр трылера «Фісгармонія» Кодзі Фукада прыедзе ў Мінск, каб асабіста прэзентаваць карціну беларусам. Дакументальны фільм BBC «Зямля. Адзін надзвычайны дзень» можна ўбачыць у кінатэатры *Falcon Club* Буцік Кіно да 4 красавіка. Над стужкай працавала каманда з 38 лепшых аператараў сучаснасці, якія пабывалі ў 22 краінах свету, каб адлюстраваць прыгажосць нашай планеты ў розных яе кутках. Фільм «Зямля. Адзін надзвычайны дзень» — працяг вядомых дакументальных фільмаў «Зямля» (2007) і «Акіяны» (2009). Рускую версію агучыў вядомы вучоны-заолаг і падарожнік Мікалай Дроздоў. Ідзе праца і над беларускамоўнай агучкай фільма.

Прыхільнікі кінаэпапеі «Зорныя войны» хутка змогуць наведаць адпаведны музей у Лос-Анджэлесе. Адмысловы будынак у выглядзе касмічнага карабля спраектаваў малады архітэктар, а аўтарам ідэі стаў стваральнік фантастычнага сусвету «далёкай-далёкай галактыкі» Джордж Лукас. Па прагнозах, будаўніцтва музея будзе доўжыцца чатыры гады і будзе каштаваць каля мільярда долараў. У экспазіцыю музея трапіць шэраг эксклюзіўных рэчаў — дэкарацыі і касцюмы для здымак фільмаў. Аматары «Зорных войнаў» ацэняць і персанальную калекцыю карцін і ілюстрацый Джорджа Лукаса: ён плануе размясціць у музеі работы, якія збіраў сорак гадоў.

Добрыя навіны і для фанатаў «бандыяны»: стала вядома, што хутка пачнуцца здымкі новага фільма пра прыгоды шпіёна Джэймса Бонда. Гэтым разам у рэжысёрскім крэсле апынуўся брытанец Дэні Бойл, які займаецца і напісаннем сцэнарыя для карціны. Хутчэй за ўсё, галоўную ролю ў фільме зноў выканае Дэніэл Крэйг. 25-ы фільм пра Джэймса Бонда мяркуюць выпусціць у пракат напрыканцы 2018 — пачатку 2019 года.

Агляд цікавінак ад Дар'і ЧАРНЯЎСКАЙ

Боль гісторыі

Фота Кастуся Дробава.

Праз прызму сучаснасці на трагедыю беларускіх спаленых вёсак паглядзелі ўдзельнікі круглага стала, арганізаванага ў Выдавецкім доме «Звязда». Балючая тэма адгукаецца дагэтуль, пра што сведчаць думкі некаторых удзельнікаў…

Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, доктар гістарычных навук:

— Мы павінны казаць сёння не толькі пра трагедыю Хатыні і іншых знішчаных беларускіх вёсак, але і перасцерагчы грамадскую думку ад мэтанакіраванай фальсіфікацыі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Сёння назіраецца небывалы і свядомы перагляд не толькі найважнейшых геапалітычных вынікаў вайны, але і маральна-этычных вынікаў перамогі над нацызмам. На нашых вачах адбываецца не проста рэвізія вынікаў Другой сусветнай вайны, але і рэабілітацыя злачынных ідэалогій, іх інстытуцыянальнае адраджэнне і легалізацыя…

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, дырэктар Інстытута гісторыі НАН:

— Безумоўна, 75 гадоў — тэрмін даволі значны. Тым больш што цяпер сапраўды ў свеце — а мы не можам ізаляваццa ад свету — гісторыя мінулай вайны актыўна перапісваецца, скажаюцца факты, дадаецца нічым не пацверджаная інтэрпрэтацыя тых падзей. Аддзел ваеннай гісторыі ў нашым інстытуце, цэнтральная тэма якога — гісторыя Вялікай Айчыннай вайны, фактычна застаецца на сёння адзіным такім спецыялізаваным навуковым падраздзяленнем на ўсёй постсавецкай прасторы. Беларускімі вучонымі дзеля таго, каб памяць і праўда аб той страшнай вайне захавалася, робіцца шмат, рыхтуюцца грунтоўныя працы. Але мы разумеем, што навуковымі даследаваннямі можна зацікавіць толькі абмежаванае кола людзей, таму робім усё магчымае, каб факты, сведчанні, памяць аб вайне знайшлі водгук у грамадстве.

Артур ЗЕЛЬСКІ, дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь»:

— Сорак дзевяць гадоў назад на месцы спаленай беларускай вёскі быў створаны самы несавецкі з савецкіх помнікаў — там не было вялікіх фігур салдат, там не было духу мілітарызму — быў толькі скамянелы, але жывы чалавечы боль. Магчыма, сёння гэты боль сапраўды не адчуваецца або адчуваецца інакш, на больш нізкім узроўні. Сама вайна перастала ўспрымацца як боль. Вайна зрабілася вясёлай гульнёй: гэта ж так цікава — «танчыкі», стралялкі. Ужо ніхто не тое што не ведае, а менавіта не адчувае, што вайна — гэта кроў, гэта страх, гэта жах... Добра, канешне, што выдаюцца навуковыя працы, зборнікі дакументаў, але, на жаль, пры ўсёй іх прабіўной сіле яны мала значаць для грамадскасці, бо людзей, якія іх чытаюць, няшмат. Мемарыялы, музеі ў гэтым плане іграюць больш значную ролю, пагадзіцеся. Несумненна, вельмі патрэбна пашыраць і працягваць працу навуковую, працаваць са сведкамі, якіх застаецца ўсё менш.

Ірына ВАРАНКОВА, старшы навуковы супрацоўнік аддзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН, кандыдат гістарычных навук:

— Варта заўважыць, што праблема захавання памяці пра вайну ў маладога пакалення ўзнікла не сёння. Як толькі з'явіліся на свет і выраслі дзеці, якія вайны не бачылі і не перажылі, гэта праблема стала актуальнай. Магчыма, так адбывалася таму, што мы спрабавалі дастукацца да пачуццяў людзей (а тут важныя менавіта эмоцыі) не праз той матэрыял. Я доўгі час працавала ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і займалася ў тым ліку і гісторыяй стварэння самога музея. План камплектавання фондаў музея стваралі яшчэ ў 1942 годзе кіраўнікі БССР, і нават сёння ўражвае, як прафесійна гэта было зроблена. У тым плане пераважалі дзве тэмы: трагедыя беларускага народа падчас акупацыі і партызанскі рух. Але потым, у пачатку 60-х гадоў, — і гэта добра прасочваецца па музейных дакументах, па паступленнях у фонды — крэн быў узяты на гераізм, а трагедыя засталася на другім плане.

Аляксей ЛІТВІН, загадчык аддзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН, доктар гістарычных навук:

— А вы не задумваліся, чаму так здарылася, што павінна было прайсці дваццаць гадоў, каб загаварылі пра спаленую вёску і пачалі ствараць сімвалічны мемарыял?.. У 1963 годзе адбылася III Міжнародная канферэнцыя па гісторыі руху Супраціўлення ў Карлавых Варах, да якой было прымеркавана выданне зборніка «Злачынствы нямецка-фашысцкіх акупантаў ў Беларусі 1941—1944 гг.», у якім, а таксама падчас канферэнцыі, беларусы ўпершыню заявілі пра генацыд, які чынілі фашысты на нашай зямлі, ахвярамі якога сталі сотні тысяч мірных жыхароў. У 1965 г. выйшла 2-е дапоўненае выданне. Зборнік атрымаў шырокі рэзананс як у СССР, так і за яго межамі, дзякуючы чаму тэма знішчэння беларускіх вёсак упершыню атрымала шырокае асвятленне. Выданне зборніка мела асаблівую актуальнасць у сувязі з прыняццем у ФРГ закона аб спыненні перасследу нацысцкіх злачынцаў, «у сувязі з заканчэннем тэрміну даўнасці» праз дваццаць гадоў пасля вайны.

З гэтай прычыны кіраўніцтва БССР у тэрміновым парадку выступіла з рэзкім асуджэннем такога рашэння ўрада ФРГ. Каб зафіксаваць гэты жах на доўгія гады не толькі дакументальна, але і манументальна, у студзені 1966 годзе Прэзідыум ЦК КПБ прыняў пастанову аб устанаўленні мемарыяльных знакаў на месцы спаленай вёскі Хатынь, адкрыцці тут філіяла Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

…У 1945 годзе на Беларусі працавала Дзяржаўная надзвычайная камісія, паводле заключэння якой у рэспубліцы было знішчана 209 гарадоў і 9200 вёсак. Калі пачалі рабіць Хатынскі мемарыял, знайшлі звесткі толькі аб 5295 паселішчах... На сённяшні час, дзякуючы дзейнасці супрацоўнікаў Дзяржаўнага нацыянальнага архіва, ёсць звесткі пра 9093 спаленыя вёскі...

Падчас размовы ўдзельнікі вылучылі прапанову аб'явіць 22 сакавіка, дзень Хатынскай трагедыі, Днём нацыянальнай памяці і смутку.

Алена ЛЯЎКОВІЧ

ПРОМНЯМІ ПАМЯЦІ

Кожная краіна мае свае мясціны, якія з'яўляюцца своеасаблівай Меккай, цэнтрам нацыянальнага пакланення, прымірэння, памяці. Для Беларусі гэта Хатынь. Назва вёскі стала сімвалам трагедыі беларускага народа ў Другой сусветнай вайне. Днямі выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» прэзентавала кнігу «Хатынь. Трагедыя беларускага народа», прысвечаную 75-годдзю гібелі вёскі Хатынь. Аўтар — дырэктар мемарыяльнага комплексу, кандыдат гістарычных навук Артур Зельскі.

Навукова-папулярнае выданне адметнае тым, што ў ім упершыню прадстаўлены звесткі з гісторыі вёскі з часоў першых згадак пра яе. Дакладны час з'яўлення Хатыні невядомы. Пісьмовыя крыніцы сведчаць, што існавала яна ўжо ў сярэдзіне XVI стагоддзя і называлася тады Хотынь. Гэты час быў «залатым векам» для сярэднявечнай беларускай дзяржавы. У спакоі і дабрабыце жыла і вёска, ператварылася

ў даволі вялікае сяло. Колькасць жыхароў налічвала 13 службаў. У тыя часы «служба» складалася звычайна з 2—3 і больш «дымоў» — сялянскіх гаспадарак. Адпаведна, колькасць «дымоў» у Хатыні была прыблізна 30—40, а жыло ў вёсцы не менш за 200 чалавек. Заможнасць хатынцаў забяспечвала не вырошчванне збожжа, а «ловы» — паляўнічыя ўгоддзі, бортніцтва, воск, што здабывалі жыхары. Агулам даніна ўладальнікам зямлі Тышкевічам складала 20 пудоў мёду і «серабшчызны» — грашовай павіннасці — па 12 грошай ад «сахі» — зямельнага надзелу — штогод. На працягу стагоддзяў ішла мірная праца на родных палетках, пашыраўся дабрабыт, узрасталі новыя пакаленні дзетак-беларусікаў. Каб праз чатыры стагоддзі быць спаленымі жыўцом рукамі карнікаў...

Людзі добрыя, помніце!
Мы любілі жыццё
І Радзіму, і вас, дарагія.
Мы згарэлі жывымі ў агні.
Наша просьба да ўсіх:
Хай жалоба і смутак
Абернуцца ў мужнасць і сілу,
Каб змаглі ўвекавечыць вы
Мір і спакой на зямлі,
Каб нідзе і ніколі
У віхуры пажараў
Жыццё не ўмірала!

Ніл Гілевіч

Былі забіты ці згарэлі жывымі ў агні 149 чалавек, сярод іх 75 дзяцей. Можна зразумець вайну, калі ідзе бітва на ратным полі. Зразумець, аднак не апраўдаць. Але ніяк не зразумець, не апраўдаць, не дараваць забойства мірных жыхароў!

Пякучы боль Хатыні — гэта боль усёй Беларусі, бо тысячы населеных пунктаў падзялілі лёс спаленай вёскі. Шмат з іх не адрадзілася пасля вайны. У выданні «Хатынь. Трагедыя беларускага народа» распавядаецца пра іншыя беларускія вёскі, знішчаныя ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі. Кніга прызначана найперш для моладзі — менавіта ад яе залежыць, якой будзе наша краіна. «Тое, што цяпер адбываецца ў свеце, прымушае звяртацца да трагічных падзей мінулых гадоў. Бо гісторыя паўтараецца. Рыхтуючы гэту кнігу, мы хацелі выклікаць у чытачоў глыбокія эмоцыі, нагадаць, што падчас войнаў ахвярамі становяцца самыя безабаронныя... На прыкладзе Хатыні мы імкнуліся паказаць, што трагедыя агульная», — падзяліўся ўражаннямі ад працы дырэктар выдавецтва Уладзімір Андрыевіч.

Падчас падрыхтоўкі выдання супрацоўнікі рэдакцыі сустрэліся з адзіным сведкам і ў той жа час ахвярай жудасных падзей 22 сакавіка 1943 года Віктарам Жалабковічам. На момант трагедыі яму было 7 гадоў. Смяротна параненая маці ў палаючай пуні захінула яго сабою, тым і выратавала дзіцяці жыццё. Шмат разоў спадар Віктар распавядаў пра гэта, але не змог стрымаць эмоцый і хвалявання.

Кніга надрукавана па-беларуску, па-руску і па-англійску і стала своеасаблівым помнікам і Хатыні, і ўсім спаленым разам з людзьмі вёскам, разбураным гарадам: кніга панарамная. Выданне багата ілюстравана фотаздымкамі часоў вайны, каторыя ствараюць карціну ўсеагульнай народнай бяды.

«Беларускія Хатыні — гэта нешта настолькі злавеснае, што людзям планеты нялёгка да канца ўсвядоміць і да канца адчуць нават пасля асвенцымаў і бухенвальдаў. Беларускія Хатыні — гэта тая рэальнасць, практыка, якую фашызм рыхтаваў цэлым краінам і кантынентам, але шырока распачаць паспеў толькі тут...» — словы Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка з кнігі «Я з вогненнай вёскі» пераканаўча гучаць і сёння.

Хатынь — не толькі сімвал памяці і волі. У Алтайскім краі знаходзіцца помнік-пабрацім нашай Хатыні. Каб стварыць яго, у 1980-я гады на Алтай была перавезена прыгаршча хатынскай зямлі. Сёння Хатынь мусіць стаць цэнтрам, які злучыць людзей па ўсім свеце, знітуе промнямі памяці, каб ніколі больш у свеце не паўтарылася падобная трагедыя.

Яна БУДОВІЧ

Рэквіем па вёсцы

Канцэрт-рэквіем «Хатынь з намі заўсёды», прымеркаваны да 75-годдзя Хатынскай трагедыі, адбыўся ў Вялікай канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

У выкананні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь (дырыжор Андрэй Галанаў) і заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Дзяржаўнага камернага хору Рэспублікі Беларусь (мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор — заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Наталля Міхайлава) прагучаў шэдэўр класічнай музыкі — Рэквіем В. А. Моцарта.

У канцэрце бралі ўдзел Аляксандр Міхнюк (тэнар), Ірына Кучынская (сапрана), Дзмітрый Капілаў (бас) і Кацярына Міхнавец (мецца-сапрана).

Міра ІЎКОВІЧ

АД ГАРАДЗІШЧА ДА СТАЛІЦЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

У Мінскай гарадской ратушы адзначылі 951-ю гадавіну першай летапіснай згадкі пра Мінск (бітва на рацэ Нямізе адбылася 3 сакавіка 1067 года). Менавіта тут прайшоў музейны лекторый з інтэрактыўнымі ілюстрацыямі «Як Мінск сталіцай стаў».

ЯК МІНСК СТАЛІЦАЙ КНЯСТВА БЫЎ

Пра гэты перыяд распавёў Сяргей Тарасаў, кандыдат гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Музея гісторыі горада Мінска.

Гісторыя горада пачалася з гарадзішча на Менцы, якое калісьці было за 16 кіламетраў ад горада. Ні ў каго з археолагаў няма сумненняў, што назва горада Мінска паходзіць ад ракі Менкі, як Полацк — ад Палаты, Віцебск — ад Віцьбы, Гродна — ад Гараднічанкі.

Пра тое, што Менск існаваў як тэрытарыяльна-адміністрацыйны цэнтр, сведчыць археалагічная карта Беларусі, якая была складзена ў 1960—1970-я гады. У ёй пазначаліся ўсе вядомыя археалагічныя помнікі. Безумоўна, там вызначаны і курганы. На карце зафіксавана толькі 80 курганоў, але на самай справе іх было каля сотні. Такім чынам, існавала прыкладна сто вёсак. У часы Кіеўскай Русі і Полацкага княства ўжо быў тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел. Ён якраз звязаны з колькасцю вёсак, у сярэдзіне якіх быў адміністрацыйны цэнтр. Гэта і стала падставай таго, што менавіта на гэты горад, на гэтую Менку трымаў курс паход братоў Яраславічаў.

Варта згадаць князя Глеба, пры якім былі зроблены значныя ўмацаванні горада. Мала хто ведае, але ў часы свайго праўлення Глеб пашырыў уладанні Менскай воласці ад Менска і да Оршы. Менавіта таму пачатак сталічнага Менска трэба ўсё ж такі лічыць нават не з Усяслава Чарадзея, які, безумоўна, таксама далучаў мясціны. А вось пабудова самастойнага княства з Менскам у цэнтры — гэта ўжо заслуга Глеба Менскага.

ЯК МІНСК СТАЛІЦАЙ ВАЯВОДСТВА БЫЎ

Пра Мінск як сталіцу ваяводства распавёў кандыдат гістарычных навук, дацэнт, старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра агульнай гісторыі і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі Алег Дзярновіч.

За перыяд XV—XVI стагоддзяў для Менска адбылася пэўная палітыка-сацыяльная эмансіпацыя. XVI стагоддзе — сапраўдны выбух для гэтага горада, таму што, калі ў ВКЛ адбылася каласальная праграма палітычна-сацыяльнай мадэрнізацыі, стварылася Менскае ваяводства. Яно не мела дачынення да старажытнага Менскага княства. Маштаб значнасці тэрытарыяльнага аб'яднальнага цэнтра прывёў да таго, што роля Менска ўзвышаецца да ўзроўню трыбуналскай сталіцы.

Трэба прызнаць, што Менск быў адным з важных рэлігійных асяродкаў ВКЛ, адным з яго цэнтраў. Менавіта таму перыяд Рэфармацыі, Контррэфармацыі, рэформы каталіцкага касцёла прывёў да таго, што на пачатак XVI стагоддзя Менск існаваў як вельмі жывы, актыўны, інтэлектуальна-рэлігійны горад.

ЯК МІНСК ГУБЕРНСКІМ ГОРАДАМ БЫЎ

У XIX стагоддзі Менск з цэнтра ваяводскага ператварыўся ў цэнтр губернскі. Пра гэтую частку гісторыі Мінска расказаў Андрэй Леанідавіч Кіштымаў, кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Рэспубліканскай лабараторыі гісторыка-культурнай спадчыны Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Усяго ў еўрапейскай частцы Расійскай імперыі ў XIX стагоддзі было паўсотні губерняў. І вось адным з губернскіх гарадоў стаў у той час Менск. Яму, можна сказаць, пашанцавала, таму што некаторыя цэнтры ваяводстваў, як, напрыклад, Мсціслаў, страцілі свой «сталічны» цэнтральны статус і сталі проста павятовымі гарадамі.

Менская губерня была самая вялікая сярод беларускіх губерняў як па плошчы, так і па насельніцтве. У пачатку XIX стагоддзя колькасць жыхароў у Менску налічвала каля шасці тысяч чалавек. Сёння гэта не цягнула б нават на большменш салідны раённы цэнтр. Дарэчы, Менская губерня сёння амаль уся ўваходзіць у склад Рэспублікі Беларусь.

Фота Кастуся Дробава.

ЯК ГУБЕРНСКІ ГОРАД МЕНСК НАБЫВАЎ ХАРАКТАР НАВУЧАЛЬНАГА І КУЛЬТУРНАГА ЦЭНТРА

У 1803 годзе была адкрыта Менская мужчынская гімназія. А вось для ратушы XIX стагоддзе было стагоддзем трагічным: яшчэ ў першай палове яе некалькі разоў перабудоўвалі. Аднак пры Мікалаі I у 1851 годзе было прынята рашэнне аб зносе Менскай ратушы. Царскія ўказы выконваліся не адразу, і канчаткова яна была знесена толькі ў 1857 годзе пры Аляксандры II.

У 1860 годзе, перад адменай прыгоннага права, у Менску налічвалася прыкладна 27 тысяч жыхароў. Магутны імпульс развіццю гарадскога жыцця і, вядома, таму, што Менск стаў сталічным горадам, далі падзеі, якія звязаны з індустрыялізацыяй і мадэрнізацыяй усяго эканамічнага жыцця. Напрыклад, з'яўленне чыгункі. У 1871 годзе Маскоўска-Брэсцкая чыгунка ўпершыню прайшла праз Менскую губерню. У 1873-м — Лібава-Роменская чыгунка. Такім чынам, у 1873 годзе Менск стаў першым чыгуначным скрыжаваннем на тэрыторыі Беларусі.

З'яўленне чыгункі пацягнула за сабой усю гарадскую эканоміку. У 1874 годзе ў Менску з'явіўся водаправод, у 1890-м — тэлефон, у 1892 — гарадскі грамадскі транспарт — конка. У 1894 годзе ў горадзе пабудавалі электрастанцыю. Гарадскія вуліцы, цэнтральныя і адміністрацыйныя будынкі атрымалі электрычнае асвятленне.

На мяжы XIX—XX стагоддзяў насельніцтва Менска перавысіла 100 тысяч чалавек, а ў 1913 годзе склала 107 тысяч жыхароў. І гэта натуральна: горад развіваўся, да чаго прывяло не толькі яго геаграфічнае становішча, але і эканамічны фактар.

ЯК МІНСК СТАЛІЦАЙ СТАЎ

Гэта патлумачыў культуролаг і мастацтвазнаўца Сяргей Харэўскі. Мінск заняў унікальнае месца на нашай зямлі. Перад Першай сусветнай вайной горад стаў безальтэрнатыўным цэнтрам беларускага нацыянальнага руху. Тут з'явілася першая беларуская палітычная партыя — Беларуская сацыялістычная грамада, стваральнікі якой фактычна склалі рэдакцыю газеты «Наша ніва». Да развіцця нацыянальнага культурнага руху далучыліся Марыя Магдалена Радзівіл, Раман Скірмунт і іншыя тагачасныя дзеячы. Напрыклад, дзякуючы фінансавай падтрымцы Марыі Радзівіл выйшлі першыя і апошнія прыжыццёвыя кнігі Максіма Багдановіча, Ядвігіна Ш., а таксама першыя кнігі Максіма Гарэцкага і Якуба Коласа пад псеўданімам Тарас Гушча.

Развівалася і архітэктура. Пабудова Чырвонага касцёла стала значнай з'явай для Мінска ў пачатку XX стагоддзя. Да працы над касцёлам яго заснавальнік Эдвард Вайніловіч запрасіў знакамітага тагачаснага польскага архітэктара Томаша Пайздэрскага. Аўтарам праекта стаў Генрых Гай — таксама вядомы польскі архітэктар, які яшчэ пабудаваў дом на скрыжаванні вуліц Маркса і Леніна і будынак Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі. Польскі мастак Францішак Бруздовіч, які касцёл распісаў, напісаў для яго абразы. А ўнутраную частку касцёла, яго дызайн, зрабіў Франц Бржазоўскі, бацька славутага беларускага мастака Генрыха Бржазоўскага і дзед вядомай беларускай балярыны Людмілы Бржазоўскай.

Мінск стаў абсалютным цэнтрам беларускага нацыянальнага і культурнага руху, за перыяд якога была абвешчана БНР, створаны каталіцкая семінарыя, Мінскі настаўніцкі інстытут, Беларускі дзяржаўны тэатр.

ЯК МІНСК САВЕЦКАЙ СТАЛІЦАЙ СТАЎ

Пра гэта расказаў Валянцін Генрыхавіч Мазец, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела найноўшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Першым дакументам, які юрыдычна адзначыў, што Мінск — сталіца БССР, стала Канстытуцыя БССР 1927 года. Будаўніцтва Дома ўрада ў 1930—1934 фактычна сведчыла пра статус горада як сталіцы савецкай Беларусі.

Мінск пацвярджаў статус сталіцы як навуковы, культурны і прамысловы цэнтр Беларусі. Былі заснаваныя Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Інстытут беларускай культуры, пабудавалі значную колькасць кінатэатраў. Вядомы сярод іх быў кінатэатр «Чырвоная зорка», у 1926 годзе рэканструіраваны з кінатэатра «Гігант». У перыяд 20-х гадоў кінематаграфічнае жыццё было наогул вельмі забаўнае. У кінатэатры «Чырвоны факел», напрыклад, цэлыя чатыры гады ў 1924—1928-я паказвалі баявік «Кацярына Вялікая (Набожная распусніца)». Першым ігравым беларускім фільмам была стужка «Лясная быль». У 1927 годзе ў Мінску быў створаны першы беларускі мультфільм, які называўся «Кастрычнік і буржуазны свет».

У гады Першай сусветнай вайны ў Мінску жыло каля 250 тысяч чалавек, 150 тысяч з якіх былі вайскоўцамі. Пасля таго як вайна скончылася і вайскоўцы сышлі, у 1920 годзе ў горадзе засталося 104 тысячы жыхароў, у 1926-м — 131 тысяча, а перад Вялікай Айчыннай вайной — 238 тысяч.

МІНСК — СТАЛІЦА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Пачатак гісторыі Мінска як сталіцы незалежнай Рэспублікі Беларусь адлічваецца яшчэ з 27 ліпеня 1990 года, калі ў Мінску Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. Пра сучасны Мінск расказаў загадчык аддзела найноўшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Сяргей Трацяк. 25 жніўня 1991 года Дэкларацыя атрымала статус канстытуцыйнага акта. Такім чынам, Мінск стаў сталіцай незалежнай рэспублікі.

Статус Мінска як сталіцы дзяржавы, як горада з асаблівым адміністрацыйным статусам быў замацаваны Канстытуцыяй — спачатку Канстытуцыяй БССР з папраўкамі, а потым у 1994 годзе Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Для Беларусі Мінск — сэрдца і галава краіны. Гэта найбуйнейшы транспартны вузел еўрапейскага значэння, прамысловы цэнтр рэспублікі, навуковы цэнтр і цэнтр адукацыі, культурны цэнтр.

Ксенія ВЯДЗМЕДЗЬ

Фота БелТА.

ГУКАЕМ ВЯСНУ!

Кожную пару года чакаюць аднолькава нецярпліва, але да вясны ў беларусаў асаблівае стаўленне — яе гукаюць. Здавалася б, няўжо яна сама не прыйдзе, пакуль не паклічаш? У нас гэтую гіпотэзу не правяраюць і з году ў год гукаюць вясну-красну. Па-першае, таму што гэта самы важны сезон для земляробаў (так было яшчэ ў нашых продкаў), па-другое, важны сам момант абуджэння прыроды, і, па-трэцяе, беларусы звязвалі надыход вясны з магічнымі рытуаламі.

Сёння «Гуканне вясны» застаецца такім жа лірычным і прыгожым святам, якім было калісьці, яшчэ ў часы паганства, адкуль і бярэ пачатак гэты магічны звычай. Вясна і тады, і цяпер асацыюецца з надзеяй чалавека на новае, лепшае жыццё. Таму і клікаць яе варта ўдумліва, паважліва і адказна. Так у нас і робяць: спяваюць песні-вяснянкі вакол вогнішча як сімвал развітання з зімой, пякуць печыва ў выглядзе птушак, якія лічацца вестунамі вясны, «затанцоўваюць» вясну — водзяць карагоды па ўсіх вясковых дварах, закопваюць у зямлю кашу — ахвяруюць зямлі на ўраджай ды, зразумела, спяваюць гукальныя песні, каб хутчэй пачуць вясновыя крокі.

У «Гуканні вясны» заўсёды бяруць удзел усе жыхары вёскі: гуляюць, смяюцца, каб паказаць вясне, што яе сапраўды чакаюць! Што да горада, то тут традыцыі захаваліся не ва ўсёй прыгажосці, тым не менш, вясну тут чакаюць гэтак жа моцна, таму народнае свята да сёння адрозніваецца жвавасцю ды весялосцю, бо сэнс вясны і яе надыходу — даць новае жыццё не толькі прыродзе, але і чалавеку.

Маргарыта ДЗЯХЦЯР,

На фота: святкаванне "Гукання вясны" ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах.

100 прызнанняў у любові

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі падведзены вынікі конкурсу «Радзіма мая дарагая», прысвечанага 100-гадоваму юбілею Алеся Бачылы.

«…І МАЛЫМ РУЧАЙКОМ УЛІВАЮСЯ»

Па глыбокім пераканні журы, узначальвала якое старшыня Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Святлана Быкава, кожны, хто прысвяціў Радзіме пранікнёныя радкі, варты ўдзячных слоў. Аўтары з розных куткоў Беларусі, Расіі, Прыбалтыкі — усе разам памножылі любоў да самага запаветнага — нашай роднай зямлі, Бацькаўшчыны, да матчынай мовы. Творы, як сведчылі ўмовы конкурсу, прымаліся новыя, раней нідзе не друкаваныя, розныя па змесце, гучанні. Сталі і розныя па ўспрыняцці. Журы перапаўнялі эмоцыі: як з лепшых выбраць самыя лепшыя?

Удзельнікамі конкурсу сталі як маладыя аматары прыгожага пісьменства, так і больш сталыя творцы; пісьменнікі, якія па-майстэрску валодаюць мастацкім словам. Далучыліся і пачаткоўцы з першай пробай пяра.

З Алесем Бачылам іх яднала вялікая любоў да Радзімы. Пра гэты душэўны парыў вельмі трапна сказаў у свой час знакаміты паэт: «І малым ручайком веснавым уліваюся / У твае чыстыя воды, радзіма мая».

«УВОЙДЗЕ — ВЯСНОВЫ, ЛІРЫЧНЫ…»

Варта нагадаць тую мінулагоднюю сустрэчу, калі ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі з'явілася невялікая дэлегацыя. Наведвальнікаў выдавалі няўпэўненыя паводзіны: яны тут упершыню. У той жа час было відавочна: імі рухае нейкая важная мэта. Таму няёмкасць пераадолелі лёгка.

Пазнаёміліся. Залілася гарачая гамонка. Так усіх узрушыў Алесь Бачыла, з нагоды святкавання 100-гадовага юбілею якога ў СПБ завіталі яго землякі, ураджэнцы вёскі Лешніца Пухавіцкага раёна, — Віктар Азаронак, Таццяна Асташонак, Валянціна Ладуцька.

Яны, лешніцкія, распавялі шмат цікавага пра выбітнага земляка. Не пераставалі дзівіцца таму, як у сціплых, на першы погляд, краявідах, ён умеў разгледзець незямную прыгажосць. Нагадалі шчыра-радзімістыя радкі паэта:

Дзе ж яшчэ ёсць такая на свеце, як ты?
Над якою зямлёй ідучы,
Так праменіцца сонца святлом дабраты,
Шчыра так «калі ласка» гучыць?

Лілія Мялешка з Клецка крыху пазней, бяручы ўдзел у літаратурным саперніцтве, напіша:

Бачылу 100 год. Хто б у гэта паверыў?
Няўжо ж гэты факт — гістарычны?
Здаецца, вось зараз адчыняцца дзверы,
І ўвойдзе — вясновы, лірычны…

Тады ў СПБ вырашылі: і літаратурны конкурс у гонар паэта правядзём, і ўлетку ўзварушым Лешніцу вясёлым настроем — збярэцца вёска на свята, пакліча гасцей. І будуць лунаць на роднымі прасторамі словы, беражоныя ў сэрцах усіх беларусаў, — «Радзіма мая дарагая».

Дарэчы, калі на Мінскай міжнароднай выстаўцы-кірмашы падводзіліся вынікі конкурсу, дэлегацыя землякоў Алеся Бачылы прыбыла ў куды больш пашыраным складзе. Усім хацелася спрычыніцца да слаўнага юбілею паэта, каб паўней наталіцца Радзімай з жывой крыніцы роднага слова. Дзякуючы ўдзельнікам конкурсу, паэтычна-песенная крыніца забурліла, заіравала таленавітым шматгалоссем.

Унук паэта, Артур Бачыла, выказаў шчырую ўдзячнасць за захаванне памяці аб яго любым дзядулі, які пакінуў для ўсіх найлепшую спадчыну — палічку адметных твораў.

«ДЗЕ ЖЫВУЦЬ УСПАМІНЫ І ПАХНЕ ДЗЯЦІНСТВАМ»

Ва ўнісон таму — і эсэ-ліст да Радзімы «Светлавокая мая, светласэрцая…» пераможцы конкурсу ў намінацыі «Проза» Таццяны Цвіркі з Клецка:

Верш А. Бачылы «Радзіма мая дарагая» чытае вучаніца 7 «М» класа гімназіі г. Дзяржынска Маргарыта Стэльмах.

Фота Андрэя Бабка.

«Радзіма мая дарагая! Няпроста прызнавацца ў сваіх пачуццях... Няпроста выказаць тое, што набалела, што прытаілася ў глыбіні душы і важкім каменем, і блакітнаю валошкаю… Табе зараз цяжка. Жорсткія законы рынкавай эканомікі, крызісныя з'явы, палітычныя складанасці не даюць упэўнена стаць на ногі. Цяжка і мне. І твой боль — мой боль, мая бела-русая зямля! Дазволь прызнацца, як моцна я цябе люблю! Я сумую па табе. З далёкай далечы легкакрылай аблачынкай памяці трапляю туды, дзе назаўсёды пакінула незабыўныя малюнкі шчасця, дзе жывуць успаміны і пахне дзяцінствам…»

У многіх творах аўтары вяртаюцца да першых сваіх сцяжынак. Тут пад матчыны песні-калыханкі распасціраўся вялікі свет жыццёвых далягляда́ў…

Пабываем на малой радзіме Валянціны Скваркоўкай, якая цяпер жыве ў Крупках:

«Успамінаю сваё дзяцінства... Вёска Сяліба Бярэзінскага раёна. Рака Бяроза — калыска майго маленства. Яно было шчаслівае, хоць часам і нялёгкае. Усплываюць яркія малюнкі: дні нараджэння, дзяржаўныя і рэлігійныя святы, якія для нас, малых, вельмі жаданыя. У святочныя дні чакалі падарункаў. Часцей за ўсё гэта былі дзіцячыя кніжкі. Асабліва мне падабаліся беларускамоўныя, бо роднае слова мела асаблівы смак…»

Па творах удзельнікаў літаратурнага конкурсу можна вывучаць не толькі геаграфію Беларусі. Іх трапныя паэтычныя вобразы ў вызначэнні адметных мясцін, безумоўна, прывабяць падарожнікаў. Скажам, як не пабываць у Брэсце? Пра слынны горад і яго тысячагадовую гісторыю захапляльна распавядае Зінаіда Дудзюк. А Галіна Гаргун упэўнена: «Лунінец будзе жыць і квітнець!». Добруш для Ніны Шкляравай — «дабрадзей добразычлівы». Валянціне Марчанцы Краснаполле «пахне мятай, рамонкамі, жытам...» А для яе зямляка Дзяніса Кустава яго дарагое Краснаполле — як подых вясны. Любоў Арлова з Петрыкава ўхваляе мілае Палессе. Пра жамчужыну сваёй зямлі — Ружанскі велічны палац — распавядае Святлана Кудлач з Пружан. Старажытныя храмы Гародні палоняць сэрца Міхаіла Калачыка з Гродна. І як не далучыцца да Алы Івановай з Наваполацка, для якой самыя шчаслівыя гадзіны — «калі спяваюць салаўі на Беларусі».

«ДА РОДНАЙ СЦЯЖЫНЫ ДУШОЙ ПРЫПАДУ»

Сярод аўтараў ёсць шмат нашых прыхільнікаў, каго вабіць Беларусь здалёк. Прыемна, што да конкурсу далучыліся замежнікі, а таксама суайчыннікі, якія, пабываўшы па-за межамі Беларусі, сталі яшчэ больш чуллівымі да сваіх бацькавін.

Так, з Даўгаўпілскага цэнтра беларускай культуры наш зямляк Станіслаў Валодзька, аўтар шматкіх песен, прысвечаных сваёй роднай краіне, дасылае чарговае шчырае прывітанне:

Беларусь святая,
Зноўку нас вітаеш
Родных хат дымамі,
Крыламі буслоў,
І ў маленства наша
Зноўку нас вяртаеш,
Клічаш на спатканне
З першаю вясной.

«Васільковая Айчына, табе шчыры мой паклон», — такі красамоўны мінчук Фёдар Баравы.

А вось задуменна-журботныя радкі таксама мінчука Уладзіміра Ашуркі наводзяць на вялікі роздум пра галоўныя каштоўнасці:

«Памяць вяртае туды, куды немагчыма вярнуцца... Нібыта ў полі кветка без паху, нібы дрэва без лісця, стаю перад домам свайго дзяцінства. Дом, мілы дом, пасля столькіх гадоў падарожжаў я зноў прыйшоў сюды.

Нібы кропля ў рацэ, што бяжыць невядома куды, да самага сіняга мора, — што я знайшоў у сваіх падарожжах? Толькі вецер, толькі хмары…

Ціхая журба, журба без канца і пачатку, ціхая і лёгкая, як песня жаўрука ў вясновым небе…

Мілая, мілая Беларусь! Я зноў тут, нараджаюся кветкай, расту каласамі ў полі, паміраю апошнім промнем. І жыву, як плынная рака.

Я зноўку тут. Я знайшоў маё сэрца, мой прытулак у глыбіні сусвету, маю святую зямлю, напоеную любоўю, сардэчнасцю і прастатой, і імкненнем да зорак».

У непарушнай адданасці роднай зямлі спяшаецца запэўніць з далёкага Екацярынбурга Уладзімір Лобач:

Не хапае мне ўдыху грудзямі,
Поўніцца сэрца ад вершаў —
Аб Радзіме чытаю, аб маме
На Уральскіх гарах я не першы.
Удыхаю і бэз, і рабіну.
Закладае напружанне вушы —
І навошта цябе я пакінуў,
Адарваўся ад бацькавай пушчы?

Мінчанка Вольга Сакалова таксама не хавае сваіх высакародных пачуццяў, бы спавядаецца перад родным краем:

Я здалёку вярнуся,
Прад табою, мой край,
Я ў паклоне схілюся,
Ты пазнай, не карай…
І не гронкай каліны,
І не кропляй дажджу,
А да роднай сцяжыны
Я душой прыпаду.

Тамара Кавальчук з Асіповіч наогул катэгарычная ў жыццёвых прыярытэтах. Але ці толькі яна адналюбка?

Прыгожых абшараў другіх мне не трэба:
Люблю Беларусь я, квітнеючы май
Ды матчыны рукі, смак пышнага хлеба…
Люблю беларускі, адзіны мой край!

«...А РАДЗІМУ КУПІЦЬ НЕМАГЧЫМА»

Цяжка не пагадзіцца і з Віктарам Сабалеўскім з Узды. Як трапна ён прыкмеціў:

На кірмашы жыццё вірам кіпіць,
Не акінуць тавараў вачыма.
На кірмашы ўсё можна купіць.
А Радзіму купіць немагчыма.

Пафасна-філасофскім настроем дзеліцца і Элеанора Бярноўская з Мінска: «Усе мы любім нашу Радзіму — Беларусь, працавалі і зараз шчыруем дзеля яе дабрабыту, ганарымся яе гісторыяй, культурай, асаблівым і мудрым стаўленнем да людзей. Ёсць яшчэ нешта асаблівае, прыцягальнае — пачуццё, якое словамі не выказаць. Гэта можна толькі адчуваць, калі гуляеш па любімых месцах Мінска, наталяешся яго прыгажосцю, радуешся яго непаўторнай абаяльнасці, якую можа мець толькі беларуская сталіца».

Як вядома, галоўны прыз конкурсу — веласіпед ААТ «Мотавелазавод» — атрымаў мінчук Дзмітрый Юртаеў. Падарунак уручыў пераможцу генеральны дырэктар прадпрыемства Мікалай Ладуцька. Чым адметны твор, прызнаны лепшым?

Калі гаворым пра Радзіму, абавязкова звяртаемся да тэмы, якая трывожнай памяццю і сёння жыве ў сэрцах беларусаў, — тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Радзіма — яе трагічныя падзеі, лёсы тых, хто загінуў за яе незалежнасць... Падзеі мінулай вайны рэхам адгукаюцца і на старонках конкурсных работ. Верш Дзмітрыя Юртаева мае назву «Абеліск». Аўтар упэўнены: ніколі не згасне Вечны агонь Перамогі!

І так сапраўды будзе заўжды! Удзячныя нашчадкі Вялікай Перамогі будуць берагчы мужную матуху Радзіму, абараняць яе мірнае неба, памнажаць найлепшыя традыцыі продкаў.

Вось з якой Беларуссю звязвае сваю будучыню Людміла Кебіч з Гродна:

Беларусь — краіна для жыцця,
Для вялікіх планаў і здзяйсненняў,
Ёсць умовы тут для развіцця
Самых смелых думак і памкненняў.

Такой дарагая Радзіма бачыцца і ўсім нам — святой, светлай, шчаслівай.

Алена СТЭЛЬМАХ,
першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, арганізатар конкурсу

Пераможцы літаратурнага конкурсу «Радзіма мая дарагая»

«Лепшы твор, прысвечаны Радзіме»
Дзмітрый Юртаеў
Намінацыя «Песня»
І месца
Канстанцін Цыбульскі
ІІ месца
Пётр Жаўняровіч
ІІІ месца
Станіслаў Валодзька
Намінацыя «Проза»
І месца
Таццяна Цвірка
ІІ месца
Вольга Маладцова
ІІІ месца
Мая Галіцкая
ІІІ месца
Уладзімір Лобач
Намінацыя «Паэзія»
І месца
Іна Фралова
ІІ месца
Валерый Максімовіч
ІІІ месца
Леанід Север
ІІІ месца
Генрых Тарасевіч
Намінацыя «Творы, прысвечаныя Алесю Бачылу»
І месца
Валянціна Гіруць-Русакевіч
ІІ месца
Лілія Мялешка
ІІІ месца
Валянціна Скваркоўская
ІІІ месца
Надзея Парчук
За актыўны ўдзел у конкурсе адзначаны:
Маргарыта Садоўская
Яна Тарасевіч
Яніна Цімашэня
Яўгенія Бачыла
Аліса Пагодзіна
Юлія Харланава
Галіна Аўхімовіч
Іван Касцян

ЖЫВЫЯ ЗГАДКІ РЫЧАРДА БЯЛЯЧЫЦА

Напісаць верш у юнацтве, каб ён адгукнуўся праз многа гадоў, азваўся радком такім значным, што даў назву цэлай кнізе, — ці магчыма такое? Магчыма. Сталася. З паэтам, аўтарам больш за дзясятак зборнікаў Рычардам Бялячыцам, які жыве сёння ў горадзе Шчучыне і выдаў кнігу «Са мной мой дзень».

Дзіўна, бо напісана быццам сёння, калі паэт размяняў сёмы дзясятак, калі час пазначаны восеньскімі рэаліямі. І чутны зімовы подых. Калі прыходзіць трывожны роздум пра непазбежнае расстанне са сваім днём. Больш за тое: у вершы сённяшняе ягонае жыццё, праца начнога вартаўніка, з якім заўсёды ноч — «душой і плоццю». Не, гэта занадта проста, прымітыўна — начны вартаўнік. Гэта не пра паэта. Бо вартуе ён княжыя скарбы, памяць гэтай зямлі, што вярнулася дзякуючы аднаўленню ў Шчучыне палаца князёў Друцкіх-Любецкіх. «Ахоўнік мінуўшчыны» — так называе сябе. Аўтар здзіўляецца: напісаў гэта ў маладосці. Атрымалася пра сённяшняе. І радуецца: са мной мой дзень.

Адкрывае кнігу краязнаўчы нарыс «Між Нёманам і Котрай», дзе згадана ўсё самае значнае з духоўнай спадчыны, створанае на шчучынскай зямлі. Гэта кніга прозы, напісаная паэтам. Відаць, прыходзіць такі час, калі хочацца разняволіць сваё слова ад паэтычнае формы, пісаць як дыхаць, не зважаючы на рыфмы, памеры. Аўтар разважае аб празаічнай творчасці: «Прыходзіць у такія моманты шмат цікавых успамінаў, якія пры складанні вершаў прамільгнуць, нібы тыя электрычкі. Празаічнае вымагае спыняцца, вяртацца назад. Жыццё ідзе больш размерана, плаўна».

Зрэшты, не заўсёды ягоная проза — творчасць празаіка. На мяжы між паэзіяй і прозай. Лірычная проза, вершы ў прозе — усё гэта сустракаем у кнізе Рычарда Бялячыца. Часам лаканічныя радкі эмацыянальна насычаныя, напоўненыя пачуццямі лірычнага героя. Напрыклад, мініяцюры «Студзень сцюдзёны», у якіх галоўны матыў — боль развітання з родным чалавекам, чытаюцца вершам:

Я прысвяціў табе паэму.
Пасля ўсяго.
І, як заўсёды,
спазніўся.
На цэлае жыццё.
Тваё.

А самае паэтычнае, шчымліва-далікатнае — у лірычнай нізцы «Крананне». Пятнаццаць мініяцюр, быццам пятнаццаць зіхоткіх пярлінаў, якія нанізаны на ланцужок пяшчоты, хвалявання, узвышэння, пакланення. Для яе, пра яе, недасяжную і такую бясконца блізкую: «Гляджуся ў люстра, якое вісіць пры ўваходзе. І баюся, што раптам у дзвярах з'явіцеся Вы і мяне назаўсёды не стане, спалоханага і непрыкметнага побач з Вамі, узвышанай і прыгожай».

«І за гарою пакланюся» — гэтая крылатая фраза Фёдара Янкоўскага стала сімвалам памяці, любові і пашаны да тых, хто шчодра аддаваў вучням не толькі свае веды, але і душу. Настаўнікам, вартым удзячнасці. І няхай між людзьмі паўстала гара вечнасці, якую не пяройдзеш, важна, каб і за ёю паклон быў спраўджаны. Так кланяецца герой Рычарда Бялячыца яму, аўтару гэтых слоў, вучонаму, прафесару-мовазнаўцу, пісьменніку Фёдару Янкоўскаму, свайму незабыўнаму выкладчыку. Быў мудрым, умеў разгледзець між студэнтаў тых, хто пазначаны талентам навукоўцы, творцы. Так, ён вылучыў са студэнцкае грамады будучага вядомага ў нашым краі мовазнаўца Тамаша Тамашэвіча. «І за гарою пакланюся» дзясяткі разоў кім толькі не цытаванае, сёння Рычардам Бялячыцам — пра свайго настаўніка. Бо варты ўдзячнае памяці. І пра аднакурсніка Тамаша Тамашэвіча, якога ўжо таксама няма.

Але найбольш кранальны ўспамін пра маладзенькую настаўніцу Варнянскай школы Валянціну Коўтун, якая, пэўна ж, спрычынілася да выбару жыццёвага шляху вучнем-выпускніком. Нарыс «Знак сёстраў» пра іх: першую беларускую паэтку XX ст. Алаізу Пашкевіч і даследчыцу яе творчасці, аўтарку рамана «Крыж міласэрнасці» Валянціну Коўтун, якія «нават былі падобныя знешне ў хвіліны ўзрушэння: вытанчана прыгожыя, стройныя, артыстычна далікатныя ў адносінах». Гэта цікавыя, жывыя згадкі. Бо пра асобу, якая ў памяці назаўсёды застанецца жывою. Аўтар пераносіцца ў той далёкі час, на ўрокі ўлюбёнай настаўніцы: «А на занятках глядзела задуменная сучасніца ў акно на вясенні сад, чытала Цётчыны вершы, і нам, старшакласнікам, здавалася, што дэкламуе сама аўтарка з далёкіх, незнаёмых часоў, з Пяшчыны на Шчучыншчыне».

Партрэты, а часцей накіды да партрэтаў цікавых людзей — паэта, блізкага сябра Юркі Голуба, прафесара Ігара Жука, настаўніка-змагара Аляксандра Кашэты, што змешчаны ў першым раздзеле кнігі «Абуджэнне», не заўсёды грунтоўныя, таму нямнога скажуць не вельмі абазнанаму чытачу. Хацелася б больш шырокае размовы пра іх працу, дзейнасць, творчасць.

Зразумела, што месца працы (натхнення!) — знакаміты княскі палац — не мог быць абыдзены ўвагай. «Вернасць паланэзу» — так называецца тэкст, які ўбірае ў сябе і элементы краязнаўчага нарыса, і лірычныя запісы, што паўстаюць з назіранняў за разнастайнымі сцэнамі каля палаца, які прыцягвае натуры рамантычныя, якіх вабяць не проста гістарычныя дэкарацыі, а нешта больш значнае. Мо сам подых гісторыі…

Фантастычныя элементы таксама з'яўляюцца ў гэтым тэксце. Бо ці бывае палац без прывідаў: былых гаспадароў, смелых рыцараў і прыўкрасных паняў? Яны прыходзяць, мінаючы сцены, з'яўляючыся з пазамежнага далёка, ажываюць, размаўляюць. Гэтыя вобразы даволі схематычныя, партрэты не вельмі выразныя. Часам пэўныя партрэтныя дэталі парушаюць гістарычную дакладнасць, калі можна так сказаць, этыкет у абмалёўцы партрэта. Тэкст не вырас да значнага твора, каб дапамагчы люду паспалітаму зразумець, якія асобы тут жылі, змагаліся, упрыгожвалі гэтую зямлю, кахалі. Хочацца верыць, што паўстане на гэтым матэрыяле (а ён вельмі цікавы) гістарычная аповесць пра князя Францішка Ксаверыя і ягоную юную жонку Марыю, пра іх час, пра іх нашчадкаў, пра лёс палаца, які столькі бачыў. І памятае.

Гумарыстычныя замалёўкі, у якіх апісаны анекдатычныя сітуацыі, змешчаны ў нізцы «Бывае». Гумар не самае ўдалае ў творчасці Р. Бялячыца. Мо таму, што адзінота ночы не вельмі спрыяльны час, каб пісаць творы, здольныя выклікаць смех.

Часам з наогул добрае мовы вылушчваюцца недакладныя словы, што гучаць не вельмі дарэчна, скажаюць уражанне ад створанага вобраза. Так, між ухвальных характарыстык «аднаго са сваіх любімых выкладчыкаў», маладога тады дацэнта Аляксея Рагулю сустракаем самаўпэўненасць — слова, што мае адназначна адмоўнае ацэначнае значэнне, не стасуецца з асобай гэтага прыгожага, сціплага чалавека. А вось граматычна няправільная фраза ўдзячнай чытачкі «Я люблю вас у прозе», якая мусіла азначаць: «Я люблю вашу прозу», пагодзімся з аўтарам, «сказана нечакана, нават смела і вобразна». Яна з тых «няправільнасцяў», якія робяць мову адметнай, насычаюць падтэкстам.

Той зачынны верш-эпіграф да кнігі перагукнуўся мне з паэтычным развітаннем Ларысы Геніюш:

Бывайце, мне ўжо пара,
За мною мой дзень клапатлівы.
Каму засвеціць зара —
Той яшчэ з вас шчаслівы.

Усё жыццё чалавечае як адзін дзень. Кароткі, незваротны, напоўнены клопатамі. Шчасце — гэта і ёсць само жыццё. Чалавек мусіць быць шчаслівы ўжо таму, што ізноў надыходзіць новы дзень, які яму дадзена пражыць. Герой кнігі Рычарда Бялячыца шчаслівы: яму яшчэ засвеціць зара, з ім ягоны дзень клапатлівы. Хай ён доўжыцца!

Альжбета КЕДА

Пачуццяў светлых хараство

У сталічным выдавецтве «Чатыры чвэрці» выйшла новая кніга Змітрака Марозава з гаваркой назвай «Храм: вершы, санеты, вянкі санетаў». На каляровай вокладцы выявы храма мы не ўбачым, разгадка сэнсу назвы зборніка — на 123-й старонцы ў аднайменным вершы. Паэт «збудаваў свой храм са слоў прыгожых, нібы з цаглін, апаленых агнём…». У гэтым віртуальным храме ягонаму сэрцу было гожа, утульна. Да таго часу, пакуль «аднойчы ноччу Шляхам Млечным сышоў, як прывід, старац да мяне». Ён назваў паэтаў храм турмою, а яго самога — вечным вязнем у ім:

Быў гэты вырак, як пад сэрца ножык,
Як перуновы стрэл сярод зімы…
Я зруйнаваў свой храм са слоў
прыгожых
І разараў пад жыта дол нямы.
Рунець яму ціхмяным днём асеннім,
Шаптацца жыту з ветрам
веснавым…
Мае ж пачуцці, мроі і памкненні
Над ім паплачуць дожджыкам жывым.

Такая жыццесцвярджальная выснова вымушае сур'ёзна задумацца над супярэчнасцямі нашай паўсядзённасці, зазірнуць усярэдзіну свайго ўласнага духоўнага храма, калі такі ёсць, над неабходнасцю яго далейшага існавання. І працягваць жыць далей так, як падказвае розум і сэрца.

На мой погляд, верш «Храм», што даў назву зборніку, можна лічыць своеасаблівым падмуркам, на якім трывала стаяць усе астатнія паэтычныя творы: санеты, вянкі санетаў, у напісанні якіх Змітрок Марозаў — непераўзыдзены майстар. Яшчэ ў 1991 годзе ён першы ў еўрапейскай літаратуры напісаў высока ацэнены літаратурнымі крытыкамі вянок вянкоў санетаў «Апакаліпсіс душы».

Сваю новую кнігу аўтар прысвяціў вёсцы-калысцы Язбы, у якой нарадзіўся і вырас, роднай Крупшчыне ў Мінскай вобласці, дарагім землякам. Таму самым першым у ёй змешчаны верш «Анкета паходжання»:

Я з вёскі,
Я — свойскі,
Язбоўскі…
Адсюль і трывогі мае.

Паэт трывожыцца за лёс Беларусі і беларусаў, за крохкі навакольны свет і выказвае сваю вялікую любоў да вёскі, яе людзей, да ўсяго, што звязана з незабыўным да скону сялянскім побытам. «Хаты. Жытняя палоска. А далей — шаша, шаша… Паміж горадам і вёскай разрываецца душа». Ён, нібы пералётны жораў, б'ецца між дзвюх радзім. Калі ж прыйдзе час і жураўліны вырай забярэ з сабою, то абяцае сэрца пакінуць гораду, а душу — роднай вёсцы.

Вясковыя жанчыны — Аляксандры, Марылі, Домны — для паэта як беларускія мадонны, што ў жыццёвым полі ніколі не сеялі зерне зла. Ён надзвычай узнёсла піша пра жанчын-працаўніц, жанчын-маці, жанчын, якія дораць нам радасць кахання, у вершах «Апошняе каханне», «Белыя зоркі лілей…», «Я Вас кахаў…», «Гучала музыка ў цішы начнога саду».

Змітрок Марозаў піша хораша, вобразна, пераканаўча, параўноўваючы поле, засеянае лубінам, з сінім морам, а поле, на якім цвіце грэчка, — з белым возерам. Умее ўбачыць у звычайнай з'яве незвычайнае: «Канае месяц. Спіць сяло. Туману шызае крыло накрыла спелыя лугі і млявай рэчкі берагі»; «Сейва жнівеньскіх зор даспявае ў гары, і канае касцёр на бацькоўскім двары»; «Напішыце мне ліст з маладосці васільковым чарнілам нябёс»; «Я раздаваў пачуцці людзям, як пан манеты жабракам…».

Любоў да Радзімы, да роднага краю неадрыўная ад сыноўняй любові да роднай мовы. У нас дзве дзяржаўныя мовы, але шмат хто пры гэтым забываецца, што родная, матчына мова была, ёсць і назаўсёды застанецца адна:

Дарэмна зласлівец жадае
Да слова ману прычапіць.
Народ мой і гэта стрывае —
І слова ярчэй заблішчыць!

Многія радкі ўздымаюцца да ўзроўню вострай публіцыстычнасці. Як, напрыклад, гэты:

«Мова гіне! Свет дзічэе!
Хутка нацыі — капец!..» —
Патрыёт наш аж пацее,
Не касец ён і не жнец.
Тых прароцтваў не баюся,
Бо сцвярджае дзед Ахрэм:
«Ёсць Купала ў Беларусі,
Значыць, людцы, не памрэм!»

Завяршаецца кніга шчымлівым, пранізліва-шчырым «Санетам маці», у якім паэт прызнаецца, што кожная сустрэча з самым дарагім чалавекам для яго як свята, што іх душы вядуць толькі адным ім зразумелую гаворку. «Хто вершы піша — не паэт, / паэт, хто сэрцам іх спявае!» — заяўляе сваё творчае крэда Змітрок Марозаў. І праспяваныя сэрцам, падслуханыя чуласцю душы вершы і санеты з новай кнігі «Храм» — яскравае таму пацвярджэнне.

Мікола ЛЕЎЧАНКА

Мікола МАЛЯЎКА

Аглядвацца не хочацца назад

Аглядвацца не хочацца назад,
Трывожыць мёртвых і жывых,
Ды мусіш —
Сабе на позняй споведзі не схлусіш.
Грашылі і чыноўнікі, і ўрад,
І сам ты не святы, на добры лад:
Таптаўся ў тупіку, хадзіў па крузе,
Зняверaны, маўчаў, панікшы ў скрусе, —
Не юбілейны ён, жыцця агляд.

Мой свет зямны! Не быў ты ціхім раем.
Па-рознаму жывём і паміраем,
І хочацца, каб зразумелі нас:
У кожным пакаленні,
Кожным лёсе
Адбілася душа,
Адбіўся час —
І ўсё, што ў часе гэтым адбылося.

Жывіла дух да спадчыны любоў

Адаму Мальдзісу

Жывіла дух да спадчыны любоў,
А нас ад продкаў адлучалі сілай,
Ад радаводу Бацькаўшчыны мілай.

Баяліся сваіх правадыроў,
І ў мірны час яна лілася, кроў:
Хавалі праўду ў турмах і магілах,
Ляпілі з нас, маўклівых і бяскрылых,
Манкуртаў паслухмяных і рабоў.

А дрэва радаводнае краіны —
Не ствол адзін, а ўсіх вякоў галіны.
І трэба працаваць з апошніх сіл,
Не падаць духам — і змагацца словам,
Каб спадчыну з архіваў і магіл
Вярнуць нашчадкам —
Пакаленням новым.

Напрацаваліся бацькі — і спяць

Напрацаваліся бацькі — і спяць.
Не проста, павячэраўшы, начуюць,
А спяць за вёскаю, не чуюць,
Як кліча час араць і сеяць, жаць,
Як б'е пярун — дубы ў камлі дрыжаць,
Як у царкве спяваюць алілуя,
Як нам зязюля клопаты вяшчуе —
Пра новы дзень і будучыню дбаць.

Старых людзей — апору нашу дома —
Закалыхала векавая стома.
Не шчодрым быў на святы лёс зямны,
Абновы бераглі — і ў тых абновах
Адпачываюць ад жыцця яны
Спакойна так,
На могілках вясковых.

За вёскаю, на мосце…

Памяці Алесі Канавальчук

За вёскаю, на мосце, твой партрэт:
Смяюцца вусны, вочы ласкай ззяюць,
На лоб спадае пасмачка жывая.
Стракозка заляцела неўпрыкмет
У твой дзявочы бесклапотны свет,
А хлопец той, які цябе кахае,
Стаіць за рамкай фота, недзе з краю, —
Прынёс пяшчотных слоў і руж букет.

На месцы гэтым, для сустрэч абраным,
Машынай збіў цябе кіроўца п'яны.
Не асвяціла лёс фатою белай,
Букет надзей завяў, пад крыжам лёг, —
Душа твая стракозкай адляцела
Туды, дзе ўсіх святых збірае Бог.

Паданне пра каханне

Без маладога віцязя, адна,
Дзяўчына згасла, як начная зорка,
З вадою параднілася ад гора.
Вярнуўся віцязь верны, а яна
Глядзіць адтуль ужо, з магілы дна.
Упаў і тут, на беразе азёрным,
Ператварыўся ён у камень чорны.
Звяла ці разлучыла іх вайна?

Дайшлі да нас падання адгалоскі:
Дзяўчына-свіцязянка з ціхай вёскі
Не стала ні русалкай, ні святой,
Але ў народнай памяці не сцьмела, —
І абдымае, лашчыць камень той
Пад навальнічным небам —
Хваляй белай.

Капялюшык — з саломкі залатой

Як ліле́я,
На вадзе бялее
Капялюшык лёгкі твой,
Ён — з саломкі залатой.

Рамантычнае спатканне
Так, пад ветразем кахання,
Мы прыдумалі з табой
Тут, у чоўне над вадой.

Падняліся, абняліся,
Човен скалыхнуўся ўнізе —
І зляцеў ён з галавы,
Капялюшык, як жывы.

Век бы не ступаць на бераг!
У жыцці, ад быту шэрым,
Непрыкметна згасла ты —
Зорка цноты, пекнаты.

Свет захма́раны тугой,
Толькі капялюшык твой
У вачах бялее,
Як ліле́я.

Не цьмее крыж на купале царквы

Не цьмее крыж на купале царквы.
І бусел побач — вернікаў вітае,
Нібыта і ў яго душа святая.
Ад ветру не хавае галавы
І ў дождж начуе тут, як вартавы,
І толькі раніцай, калі світае,
Ён над вясковым бытам узлятае —
Глядзіцца ў небе сам,
Як крыж жывы.

Люблю буслоў — старых і навасёлаў,
Чакаю з выраю, нібы анёлаў.
Яны і сёння, у няпросты час,
Спакоем ахінаюць свет блакітны —
Пад крыламі ахоўнымі гучаць
І песні-калыханкі, і малітвы.

Прыспешваў час я, малады

Прыспешваў час я, малады.
Жыццё ішло павольнаю ступою,
На збег падзей і ўражанні скупое.
І вабілі, і сніліся тады
Вакзалы і прычалы, гарады,
Не адчуваў яшчэ так моцна повязь
З людзьмі і родным светам лесу, поля,
Багаты на дарогі і гады.

Чарговы юбілей як напамінак:
Не за гарамі канцавы прыпынак.
Не ведаю, калі на ім сыду,
А век-экспрэс ляціць, аж свішча вецер, —
І хочацца саскочыць на хаду,
Каб затрымацца тут, на гэтым свеце.

Таццяна БАРЫСЮК

Рытарычнае пытанне

Як ратаваць сваё Сонца душы,
той, што забіта знявагаю роспачнай?
Як навучыцца, праз пекла праходзячы,
скаргі свае ў скрушным сэрцы душыць?

Калядны сум

Я пішу свой калядны дар — верш.
А натхнення — няма і не будзе.
Толькі самападманам — давер
да здзяйснення фантазій аб цудзе.

Я прачнуся бязрадасным днём
без амбіцый да ног зоры кінуць.
А каханы знікае са сном,
бо ён сам для сябе — сэнс адзіны.

А я жыць не магу і не жыць!
Божы клопат сыдзе паратункам.
А сляза ледзяная дрыжыць,
студзень сэрца снягамі ахутаў.

Будзе дзень — будзе мройлівы шанц
здзейсніць так, што дабро пераважыць.
Зноў у бой — без прываблівых зман,
што каханне і шчасце — дасяжны…

Вы і Парыж

Я па вулках ішла брукаваных,
разважала аб шчасці й духоўнасці.
Я ў Парыжы была разам з Вамі:
Вы былі ў маёй мройнай свядомасці.

Што здзяйсняюцца хутка жаданні —
бачу ў тым нашу сувязь прычынай.
Даяце Вы мне сілу і магію
свет тварыць, адраджацца жанчынай.

***

Куды прыводзяць мары? Да яго.
Да вуснаў, да вачэй, да доўгіх пальцаў.
Ва ўзроку я шукаю пробліск зор,
ва ўсмешцы — нашых дзвюх энергій
танцы.

Баюся, што не стрэнемся калісь,
што будзе мне забыць яго так цяжка!
Жыццё таксама хутка праляціць.
Я так хацела, каб мяне заўважыў!

Так марыла да сэрца прытуліцца!

Андрэй КОЗЕЛ

Адзінота

Зайшла учора Адзінота:
Кранула грыф, адкрыла ноты;
Зайграла лад тугі, няпросты;
Дастала пульт, знайшла і кросны.

І нешта ткала — шлях, дарогу —
Кілім жыцця, перасцярогу:
Каб не баяўся дзесьці збочыць,
Ішоў хутчэй, глядзеў у вочы.

Каб не забыўся на рашэнні,
І грошай поўныя кішэні…
Туга ўзяла мяне, маркота,
Хоць і выходны быў, субота.

Я гнаў журбу, дурныя думкі,
Схапіў кілім, злажыў у сумку.
Пайшоў на двор — далёка кінуў,
Пясок — наверх яшчэ і гліну.

І расхадзіўся раптам вецер.
Ды завываў усё, вярэдзіў.
Халодны дождж згінаў мне плечы.
Я недзе чуў, што час залечыць.

Сам-насам

Давай забудзем на работу,
адключым комп, мабілы. Потым
забудзем коды, нумары,
закінем лічбы, адрасы.

Не узгадаем на праблемы,
на безліч слоў і на прабелы,
на крыўды, здрады, ночы, дні,
на сонца, месяц, зор агні.

Сяброў і ворагаў забудзем,
усіх разумнікаў і суддзяў.
Закрыем вокны, ўсе замкі —
і будзем толькі — я і ты…

***

Абляцелае попелам,
дарогай астатняю,
дажджавымі шматкроп'ямі;
вясновымі, статнымі
навальніцамі-думкамі,
разбітымі дотамі —
так жыццё б'ецца, тумкае
як яго сцягнуць дротам.
І пухіры леглі ў лужыне,
набраклі нябёсамі,
ды пад плахай астуджанай
іх дождж лопнуў як вёсламі.
Прабягала мінулае
ў сапраўднасць прыступкамі,
і вясёлкаю, чулае,
сышло ў наступнае.

Фота Кастуся Дробава.

Зінаіда ДУДЗЮК

ХОКУ

Апавяданне

Кітаец Хонгуі Куан сядзеў на беразе невялічкай сажалкі, зарослай трыснягом, і спрабаваў уявіць заўтрашні дзень. Сонечныя промні адбіваліся ў вадзе і асляплялі хлопца, апранутага ў шэрыя канапляныя штаны і куртку. Ён жмурыўся і міжвольна ўсміхаўся. Ягонае імя перакладалася як «бляск вясновы», а таму свячэнне вады радавала. Сажалка быццам мела таемнае дачыненне да лёсу кітайца, якога жыццёвы шлях прывёў у Японію, дзе ён павінен быў знайсці сабе добрую службу. Выкліканы гэты пераезд быў тым, што прынц Сётоку-тайсі, прыхільнік кітайскай мадэлі развіцця дзяржавы, дазволіў кітайскім рамеснікам, манахам-будыстам і людзям адукаваным сяліцца ў Японіі. З ліку апошніх быў Хонгуі Куан. Вясной ён паспяхова здаў экзамены ў школе кніжнікаў і цяпер меў намер заняць якую-небудзь пасаду ў гэтым японскім гарадку, дзе ўжо знайшоў сабе кватэру ў старога ўдаўца, даволі прыязнага. Куан рызыкаваў: раптам тутэйшае начальства не захоча мець з ім справу, але ж чуў ад землякоў, што ў Японіі, як, дарэчы, і ў Кітаі, вельмі паважаюць адукаваных. Пра тое, што Куан не займаецца фізічнаю працаю, а далучаны да шэрагу вучонай эліты, найперш красамоўна сведчылі ягоныя доўгія пазногці. Праўда, захаваць гэтае хараство дапамаглі хлопцу медныя напарсткі, якія ён надзяваў на пальцы, калі даводзілася дапамагаць па гаспадарцы бацьку, які быў звычайным селянінам, але за апошнія дзесяць гадоў выбіўся ў старасты селішча, сабраў грошай, каб хоць адзін з сямі сыноў атрымаў адукацыю і стаў важным чалавекам. Пра адметную шаўковую шапку і пасак, якія насілі чыноўнікі самага высокага рангу, марыў бацька для свайго сына, можа, нават больш, чым сам Куан, якога трохі палохала новае асяроддзе. Аднак хлопец быў перакананы, што гэта ў Кітаі цаніўся высокі ранг вучонасці, які маглі даць сваім дзецям толькі вельмі багатыя людзі, а ў Японіі галоўнае было — атрымаць добрую пасаду, з якою даваліся пажыццёвыя прывілеі, а заадно прысвойваўся адпаведны ранг. Ведаў, што цяпер у Японіі не хапала чыноўнікаў, таму да іншаземцаў з адукацыяй не практыкаваўся адмоўны падыход у залежнасці ад іхняй этнічнай прыналежнасці ці рэлігійных перакананняў, а маладых японцаў накіроўвалі ў Кітай на вучобу. Наконт гэтага можна было не хвалявацца, турбавала іншае: Куан быў упэўнены, што ён даволі здольны, але тугадум, якому цяжка даваліся рыфмы. Ды суцяшала тое, што японцы пісалі вершы нерыфмаваныя. Галоўнае — умець выказаць свае пачуцці яскравым вобразам. Кожны кітайскі службовец абавязаны быў пісаць вершы. Прынамсі, Куан паспяхова здаў пісьмовы экзамен, таму што склаў гераічную паэму, але якіх высілкаў яму гэта каштавала! Ён цэлы год патраціў на стварэнне таго твора. У Кітаі пісаліся пяцірадковыя ці сямірадковыя вершаняты, і змайстраваць нешта паэтычнае, хоць і каструбаватае, яму так-сяк удавалася, калі меўся час на абдумванне. А раптам начальнік загадае неадкладна скласці верш пра тое, што адчуваеш! Як у адно імгненне сабрацца з думкамі і зрабіць паспешна тое, што патрабуе часу і роздуму? Куан вырашыў патрэніравацца. Акінуў позіркам сажалку, прыслухаўся да сэрца: што падказвае? Раптам з трыснягу выплыла дзікая шэранькая качка, вывадак качанят і прыгажун селезень з зялёнай аксамітнай шыйкай. Калі добра нацешыўся, назіраючы за птушкамі, дастаў са скураной торбы пэндзлік, умачыў у ваду, пачакаў, пакуль поўсць стане мяккая, потым некалькі кропель вады выціснуў у каменную чарніліцу, у якой хутка і лёгка расцёр палычку тушы да масляністай кансістэнцыі. Аркуш паперы паклаў на вялікі камень, што ляжаў на беразе, і пачаў пісаць іерогліфы.

Качкі ў цёплай вадзе
маюць ежу ад лета,
і асалоду, і радасць,
множаць свой род.
Што чакае Куана
ўдалечыні ад радзімы?

Верш уклаўся ў шэсць слупкоў іерогліфаў, што не адпавядала канону, бо трэба было пяць або сем, і наогул выйшаў не надта ўдалы, таму што выяўляў разгубленасць аўтара і няўпэўненасць у заўтрашнім дні…

Селезень водзіць
сямейку сваю,
яму без патрэбы
дзяржаўная служба.
Ён шчаслівейшы
за мноства кітайцаў,
што ўдачу шукаюць
у чужой старане.

Гэты верш цалкам адпавядаў настрою Куана, аднак атрымаўся з васьмі слупкоў іерогліфаў, а гэта зноў было адступленне ад канона. Куан уздыхнуў і зноў узяўся за справу. Да ўпартай настойлівасці яго прывучылі ў школе, дзе даводзілася займацца ад ранку да вечара, вучыць на памяць мноства філасофскіх трактатаў, а пасля расказваць настаўніку, стоячы да яго спінай, каб не бачыць кнігу з бамбукавых дошчачак, па якой той правяраў, ці правільна вучань адказвае заданне. Гэта была цяжкая навука з пакараннем і прыніжэннем ды яшчэ з падзякаю за біццё, бо ўсё рабілася для карысці выхаванца…

Шапатлівы трыснёг
ведае ўсе таямніцы,
якіх назапасіла летам
сямейка качыная,
толькі Куан
не дазнаецца іх ніколі,
бо ён старонні тут чалавек.

Гэты верш хоць і спадабаўся самому Куану, але яго нельга было чытаць японскаму начальніку і паказваць сваю чужароднасць у краіне, дзе хацеў уладкавацца на службу. Падумаў, можа, варта ўзяць які-небудзь верш, з раней складзеных, але спахапіўся, што тыя радкі ніяк не будуць адпавядаць ягонаму стану душы і пейзажу, у якім ён апынецца. Начальнік зразумее падман і не захоча мець справу з хлуслівым чалавекам. Трэба было сабрацца з духам, падрыхтавацца до ўсялякага надвор'я, якое б яно ні было: сонечнае ці пахмурнае, і скласці вершык хаця б на пяць радкоў пра самыя лепшыя свае надзеі, якія маглі спраўдзіцца тут і цяпер.

Цешыцца неба
радасці кожнага з нас.
Мы — яго дзеці...

Далей гэтых трох слупкоў іерогліфаў Куану не ўдалося прасунуцца ні на слова. Прыходзілі нейкія думкі, але былі яны нягеглыя і недарэчныя. Куан глядзеў, як паступова коціцца сонца за горы, і разумеў: пражыты яшчэ адзін дзень, пройдзена яшчэ адна прыступка да мэты, якую абавязкова трэба дасягнуць. Нечы голас вывеў яго з задуменнасці, азірнуўся на хатку ўдаўца, дзе яму сёння належала начаваць, і ўбачыў гаспадара, які клікаў вячэраць…

Раніцай Хонгуі Куан увайшоў у шырокія вароты сядзібы тутэйшага начальніка. Каля ўваходу ў дом раскашавала ружовая азалія, на сонцы залацілася пладамі лімоннае дрэва, зводдаль над горкай з камення ўзвышаліся сасна і туя. Хлопец зрабіў колькі крокаў і ўбачыў гаспадара, які выйшаў на веранду, адкрытую на лета. Гэта быў стараваты чалавек, апрануты ў кіна — доўгую сарочку, перахопленую шырокім паскам. Госць пакланіўся ў знак прывітання, назваў сваё імя і прозвішча, расказаў, з якою мэтаю з'явіўся. Чыноўнік памыляў вуснамі, пашчыпаў рэдзенькі вус, нібы нешта абдумваючы, і адказаў:

— Ёсць адна вольная пасада службоўца па наглядзе за своечасовым зборам падаткаў. Як вядома, зерне — жыццёвая рака дзяржавы, а падаткі — яе скарб, таму патрабуюць дакладнага ўліку. Якую маеш адукацыю?

Хлопец моўчкі дастаў з торбы паперы і з паклонам падаў начальніку. Той уважліва пагартаў і пачытаў іх, а пасля хітравата зірнуў і спытаў:

— Атрымаў другую ступень адукацыі — «цзюйжэнь»?

Хлопец ў адказ моўчкі згодна кіўнуў.

— Ну, пакажы мне сваё майстэрства.

Хонгуі Куан сеў на траву, падкурчыў пад сябе ногі, дастаў з торбы пэндзлік, зняў корак з чарніліцы, ліхаманкава думаючы пра тое, што ён зараз павінен напісаць. Аркуш паперы зручна прыладзіў на торбе, балазе яна была скураная і даволі цвёрдая, на імгненне задумаўся і вывеў першы іерогліф. Начальнік зацікаўлена схіліўся над ім. Кітаец напісаў тры слупкі іерогліфаў:

Азалія ўдзячна
глядзіць на гаспадара,
мне добры прыклад...

Больш нічога вартага ў галаву не прыходзіла. Калі б Куан быў адзін, ён падраў бы гэты аркуш і нікому б не паказваў, а тут начальнік чакаў працягу. Хлопец утаропіўся ў паперу. Лоб ягоны пакрыўся кроплямі поту, а твар ад напружання зрабіўся чырвоны, таму ён нагнуў галаву ніжэй, каб не паказваць сваю слабасць.

— Добрая каліграфія, прыгожа пішаш, але гэта ўсё? — спытаў начальнік. — Хіба цяпер у Кітаі складаюць трох-радковыя вершы?

— Так, — зманіў хлопец, — згадзіцеся, вельмі зручна.

— Сапраўды, а мы тут складаем па пяць ды па сем слупкоў, можна сказаць, робім лішнюю работу, — задаволена хмыкнуў начальнік. — Бач ты, і сэнс ёсць, і пачуццё, і прырода... Пакінь мне на памяць гэты аркуш. Сёння пахадзі па ваколіцах, пазнаёмся з мясцовасцю, а заўтра прыступіш да працы, атрымаеш уласную пячатку і сродак перамяшчэння, як і належыць службоўцу.

Хонгуі Куан падзякаваў начальніку, хуценька сабраў свае прычындалы, схаваў у торбу, пакланіўся на развітанне і патупаў азіраць ваколіцы гарадка. Яму было няёмка за ўласную хлусню і нават трохі смешна, што такі паважаны і немалады чалавек лёгка паверыў ягонай выдумцы. Апраўдваў ён сябе мудрым выказваннем Кун Фу-цзы*: «Не той вялікі, хто не падаў, а той вялікі, хто падаў і падымаўся»…

За гарадком ажно да лесу раскінулася бяскрайняе рысавае поле. Павіслыя мяцёлкі з дробнымі каласкамі на зялёных кусціках злакаў пажаўцелі. Ён залюбаваўся палеткам, ажно захвалявалася ягоная сялянская душа ад гэтага хараства і міжвольна падумалася: «Калі каласкі стануць карычневыя, тады пачнецца збор ураджаю, а мне давядзецца ўважліва сачыць за своечасовай выплатай падаткаў зернем». Пастаяў колькі хвілін, радасна азіраючы поле, а пасля павярнуў на сцежку, якая спускалася ў нізінку. З-за кустоўя раптам узнікла вузенькая празрыстая рэчачка між берагоў, парослых сакавітай травою, зялёныя пасмы якой паласкаліся ў вадзе, спрабавалі імкнуць па цячэнні і вярталіся назад, бо іх утрымлівала карэнне. Хлопцу міжволі падумалася, што так і людзі ў большасці сваёй застаюцца жыць на родных котлішчах, таму што душою прыраслі да гэтай зямлі, а ён з тых, хто пераадолеў прыцягненне радзімы і мусіць абжывацца на чужыне...

Яму асабліва спадабаўся мосцік з ліянаў праз рэчку, такая прыемная гойдалка, амаль як арэлі. На ім ён і прымасціўся, каб памыць пэндзлік і чарніліцу, а потым доўга глядзеў на бягучую ваду і марыў, як некалі ён заробіць шмат грошай, прыедзе дамоў, пабудуе сваю сядзібу, ажэніцца і будзе жыць доўга і шчасліва. Праўда, іншы раз прыходзіла думка, маўляў, добра было б стаць вялікім чыноўнікам, жыць у сталіцы, мець свой палац, насіць адзенне, размаляванае драконамі, але гэтая мара была недасягальная, а таму пустая, бо вялікімі начальнікамі рабіліся толькі дзеці вялікіх начальнікаў. Не варта жадаць немагчымага, вунь Кун Фу-цзы хоць і выбіўся з галечы ў прыдворныя, а пасля сам адмовіўся ад службы і вандраваў з вучнямі па краіне, дзяліўся мудрасцю з людзьмі. Безумоўна, Кун Фу-цзы — цяпер амаль бог, менавіта ягонай выяве і настаўніку павінны кланяцца вучні, уваходзячы ў школу, і вучыць на памяць творы, даўным-даўно напісаныя знакамітым філосафам. Што і казаць, Кун Фу-цзы — з'ява рэдкая. Ён не быў такім тугадумам, як Куан, для якога вялікі настаўнік шматлікіх пакаленняў кітайцаў пакінуў мудрую думку для супакаення душы, што жыццё — рэч простая, але людзі яго настойліва ўскладняюць...

***

Тым часам стары начальнік падаўся да свайго маладзейшага калегі і, нічога не тлумачачы, паказаў аркуш з іерогліфамі, намаляванымі кітайцам.

— Што гэта? — спытаў гаспадар.

— Верш... Цяпер такія пішуць кітайскія службоўцы, — адказаў госць. — Прыехаў кітаец наймацца на працу. Я вырашыў праверыць ягоныя здольнасці ў вершаскладанні. Ён і выдаў гэты твор.

— Цікава! Ну і спрытнюгі гэтыя кітайцы! Да чаго дадумаліся! Тры радкі — і маеш вершык! А мы тут, сапучы, па пяць ды па сем складаем! Гэта ж такая палёгка! А мо гэта іхняя дзяржаўная таямніца?

— Можа, і таямніца, але мы цяпер яе ведаем!

— Як завуць таго кітайца?

— Здаецца, Хок Куа... Неяк так... Ды якая розніца, як яго завуць. Галоўнае, што ён вельмі дарэчы прынёс нам цікавую навіну, а мы яе выкарыстаем, як заўсёды рабілі нашы продкі, беручы лепшае ў суседзяў.

— Думаю, трэба ж нам неяк па-свойму назваць гэту вершавану форму, каб кітайцы не сказалі, што мы і гэта ў іх пераняллі, — адказаў гаспадар і на момант задумаўся, а пасля ляснуў сябе па ілбе даланёю, быццам выбіваў патрэбную думку, і ўскрыкнуў. — Нам нічога не трэба мудрыць, мы ж маем хоку — першую страфу рэнга**! Верш з трох радкоў — хоку!

— Малайчына, падымай ветразь свайго таленту, вынаходлівасці ў цябе не менш, чым у кітайцаў! — захоплена сказаў старэйшы начальнік, для якога складанне вершаў заўсёды было непамерна цяжкаю справаю.

Мілая гутарка двух сяброў скончылася прыемнай чайнай цырымоніяй. За новую вершаваную фому нават было выпіта па напарстачку сакэ...

***

Хонгуі Куан добра паказаў сябе на службе і з часам заняў месца таго старога начальніка, які некалі ўзяў яго на працу. Ён звыкся з японскімі звычаямі і добра пачуваўся ў чужой краіне, а таму пакуль не планаваў вяртацца на радзіму. Адно найбольш здзіўляла яго, што трохрадковы верш хоку стаў вельмі папулярны сярод тутэйшых службоўцаў. Ён нават пачаў сумнявацца ў тым, што гэта з-за яго пайшла такая завядзёнка ў суседняй краіне. Можа, японцы самі стварылі такую форму верша. Ды на гэтае пытанне ніхто не мог даць яму адказ, бо вершы жывуць, гэтак жа, як вецер: узнікаюць ніадкуль, а часам наступае ў душы заціішша, што ніякія ўзвышаныя пачуцці не наведваюць яе. Іншы раз здараецца ў сэрцы тайфун, тады яно крычыць і плача, праўда, вершы, складзеныя з такім настроем, найчасцей нічога не вартыя, як патрушчаны лес пасля бурану.

---

*Кун Фу-цзы (імя лацінізавана як *Canfucius*) — старажытны мудрэц і філосаф Кітая.

**Рэнга — жанр старажытнай японскай паэзіі.

Паразумецца на мове паэзіі

Калі працаваў над падрыхтоўкай да друку першай акадэмічнай «Анталогіі сучаснай рускамоўнай паэзіі Беларусі», збіраў і сістэматызаваў багаты і шматстайны матэрыял, давялося пазнаёміцца (вочна ці завочна) з вялікім мноствам розных і цікавых паэтычных асоб. Розных і цікавых каларытам і адметнасцю чалавечых лёсаў, прафесійнай дзейнасцю, стаўленнем да жыцця і чалавека, філасофіяй мыслення, урэшце, характарам і методыкай працы з мастацкім словам. Давялося пераканацца, што сучасная рускамоўная паэзія Беларусі — унікальная з'ява на літаратурнай карце Еўропы.

Яна апелюе да беларускіх і рускіх духоўна-сацыяльных і ідэйна-мастацкіх традыцый і каштоўнасцей і з'яўляецца неад'емнай часткай адначасова беларускага і рускага грамадска-культурнага асяроддзя. Гэта творчасць рускіх па сваім менталітэце, выхаванні, нацыянальным генетычным кодзе, тыпе светаадчування і вобразнага мыслення, а таксама рускамоўных беларускіх аўтараў. Развіваючыся на фоне інтэнсіўнага беларуска-рускага грамадска-палітычнага і сацыякультурнага дыялогу і ўзаемадзеяння, яна ўвасобіла эвалюцыю і фарміраванне самых розных, часам нават супрацьлег-лых, а то і ўзаемавыключальных светапоглядных ліній. Пры адлюстраванні характэрных асаблівасцей беларускай сацыяльна-гістарычнай рэчаіснасці, выяўленні тыповых рысаў унутранага свету сучасніка, грамадзяніна Беларусі, рускамоўная паэзія Беларусі заключае ў сабе складаны механізм спалучэння багацця і шматстайнасці рускіх і беларускіх нацыянальна-культурных парадыгмаў, архетыпаў адвечнага народнага мыслення і мадэляў новай літаратурнай сітуацыі, спецыфікі постмадэрнісцкай свядомасці.

Гэта творчасць найперш тых паэтаў, якія нарадзіліся і выраслі ў Беларусі. З іх, напрыклад, А. Аўруцін, В. Паліканіна, М. Ганчароў, Ж. Міланові, А. Міхаленка, В. Норына, А. Скарынкін, А. Цяўлоўскі Г. Мартынчык жывуць і працуюць у Мінску; В. Кудлачоў, А. Нікіпорчык, Л. Шаўчэнка, Д. Радзівончык, М. Цітарчук, В. Агапонава — у Гродне; М. Намеснікаў, А. Крыклівец, М. Бабарыка — у Віцебску; Г. Лапацін, А. Асенчык, А. Ананьеў — у Гомелі; В. Грышкавец, Ж. Завацкая — у Пінску; М. Кавалевіч — у Брэсце; І. Катляроў — у Светлагорску; Т. Дашкевіч — у вёсцы Валяр'янава Мінскага раёна і г.д. Значнае месца ў сучаснай рускамоўнай паэзіі належыць аўтарам, якія ў выніку розных жыццёвых абставін пераехалі з іншых рэспублік былога СССР, галоўным чынам, з Расіі, у Беларусь. Гэта М. Шыпілаў, С. Яўсеева, Ю. Фатнеў, Т. Краснова-Гусачэнка, Г. Кісялёў, Ю. Сапажкоў, Т. Залеская, М. Наталіч, А. Слашчоў, С. Кражава, А. Чубараў, А. Сяшко. Для іх Беларусь стала другой радзімай. Некаторыя рускамоўныя паэты, наадварот, пакінулі Беларусь, з'ехалі ў Расію, Ізраіль, Злучаныя Штаты Амерыкі і іншыя краіны. Аднак яны не парываюць сувязей са сваёй Маці-Радзімай, удзельнічаюць у яе грамадска-культурным жыцці, друкуюцца ў беларускіх літаратурна-мастацкіх выданнях, публікуюць тут свае кнігі, сустракаюцца з чытачамі і г.д. Напрыклад, І. Бурсаў, У. Арцёмаў, П. Кошаль, В. Ліпневіч, Н. Трэя, М. Маліноўская цяпер жывуць і працуюць у Маскве; Р. Трэстман, Ф. Чэчык, Ю. Драбкіна пераехалі ў Ізраіль, а Н. Татур, А. Габрыэль, Р. Лапушын — у ЗША.

Сярод дзясяткаў, несумненна, яркіх і арыгінальных мастацкіх талентаў не згубіўся паэт няпростага жыццёвага лёсу Віктар Куц з Гродна. Віктар (сапр. — Віталь) Куц нарадзіўся 2 лютага 1940 года ў вёсцы Рыбакі Шчучынскага раёна на Гродзеншчыне. У 1957 годзе, пасля заканчэння сярэдняй школы, паехаў на Цаліну. Працаваў рознарабочым, падлікоўцам у зернесаўгасе «Вішнеўскі» Акмалінскай вобласці Казахстана. Закончыў з адзнакай Балхашскае тэхнічнае вучылішча (1960).

З 1961 года жыве ў Гродне. Працаваў механікам, пасля заканчэння Гродзенскага хіміка-тэхналагічнага тэхнікума — майстрам, інжынерам па абсталяванні на Гродзенскай тытунёвай фабрыцы.

Вершы на рускай мове піша з дзяцінства. Друкаваўся ў рэспубліканскіх газетах і часопісах «Літаратура і мастацтва», «Нёман», «Белая Вежа», «Новая Няміга», у калектыўных зборніках «Галасы», «На нёманскай хвалі» і іншых.

Апублікаваў зборнікі вершаў: «Котринские зори» (2003), «Крылья водолея» (2007), «Яблоня у дома» (2008), «Белое молчание берез» (2010), «Равноденствие» (2012), «Дикая ягода» (2013), «Азбука сердца» (2016) і інш. Аўтар паэмы «Восьмая палата» (2012), а таксама кнігі прозы «Время волков» (2016). Напісаў цікавыя апавяданні: «Догоревший костер детства», «Привкус миндаля», «Покров день» і інш.

Разам з вершамі для «Анталогіі сучаснай рускамоўнай паэзіі Беларусі» Віктар Куц даслаў нам некалькі цікавых матэрыялаў з гісторыі сваёй літаратурнай дзейнасці ў Гродне. Прапаную ўвазе чытачоў «ЛіМа» яго кароткія згадкі пра сустрэчы з Васілём Быкавым.

Мікола МІКУЛІЧ

Аляксей Карпюк і Васіль Быкаў

БЫКАЎ БЛАСЛАВІЎ

Сустрэчы з класікам

У шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя наша абласная газета «Гродзенская праўда» часта расказвала пра выступленні пісьменнікаў у розных працоўных калектывах, школах, бібліятэках, клубах. Гэтыя сустрэчы арганізоўваў літаратурны кансультант газеты, выдатны беларускі пісьменнік Васіль Быкаў.

Скончыўшы ў 1957 годзе школу, паехаў па поклічы сэрца ў Казахстан асвойваць цалінныя землі. Працаваў у зернесаўгасе, вучыўся ў тэхнічным вучылішчы г. Балхаш, будаваў Магнітку. Мае першыя вершы з'явіліся ў газетах «Балхашский рабочий» і «Комсомолец Караганды». Вярнуўшыся ў 1961 годзе ў Гродна, уладкаваўся механікам на фермзаводзе, але захапленне паэзіяй прывяло мяне ў рэдакцыю «Гродзенскай праўды». Там і пазнаёміўся з Васілём Уладзіміравічам Быкавым. Прачытаўшы мае вершы, ён адразу аддаў іх у друк, а мяне стаў называць маладым рабочым паэтам. Яму вельмі спадабаўся верш пра маю прафесію «Цыгарэтчык».

Летам 1964 года Васіль Быкаў запрасіў выступіць з вершамі ў клубе памежнікаў па вуліцы М. Горкага. Нас было пяцёра: Васіль Быкаў, Аляксей Карпюк, Данута Бічэль-Загнетава, Вольга Іпатава і я. Васіль Уладзіміравіч распавёў салдатам пра сваю творчасць, прачытаў апавяданне «У той дзень». Дагэтуль помню радкі таго быкаўскага апавядання. Пісьменнік паказаў карціну сустрэчы нашых войскаў з саюзнікамі, дзе негр Джым, які ваяваў супраць Гітлера, упершыню пабачыў рускіх. Ён чуў пра Сталінград, Леніна. Яму спадабаліся простыя, смелыя рускія хлопцы. У той час як неграў у яго на радзіме не лічылі за людзей.

Аляксей Карпюк прачытаў некалькі ўрыўкаў са сваёй кнігі «Данута». Цёплымі салдацкімі апладысментамі былі ўганараваны паэтэсы Загнетава і Іпатава.

— А цяпер перад вамі выступіць малады рабочы, паэт Віктар Куц. Сустракайце! — аб'явіў Васіль Уладзіміравіч.

Я быў з памежнікамі прыкладна аднаго ўзросту і па сабе ведаў, што салдатам патрэбны вершы пра каханне, пра тых, хто іх чакае і цалуе па начах іх лісты. Мае вершы ўзбадзёрылі аднагодкаў. Яны папрасілі прачытаць яшчэ. Раптам Васіль Уладзіміравіч кажа:

— Віктар, а ты прачытай вершы пра сябе, — і дадае. — У Віктара ёсць верш «Цыгарэтчык». Ён працуе механікам на заводзе і выпускае для вас цыгарэты «Армейские».

Давялося выконваць просьбу:

Иная профессия как-то звучит,
Ну, к примеру: Геолог! Разведчик!
А моя-то, тихоня, молчит, не бренчит,
Кто я? Я — сигаретчик…

Калі я скончыў чытаць, на мяне пасыпаўся град пытанняў: «Для чаго ў цыгарэты "Армейские" падсыпаюць якуюсь дабаўку?»; «Ці праўда, што гэта дабаўка ў выглядзе дробных вермішэлін — не што іншае, як спецыяльныя вітаміны, каб салдаты не хацелі бегаць у звальненне?»… Давялося тлумачыць, што гэта ўсяго толькі спрасаваная перасохлая тытунёвая крошка. Тытунь у працэсе перапрацоўкі дае шмат адходаў у выглядзе здробненых у пыл тытунёвых лісцяў. Машыны на такім тытуні не могуць працаваць. Раней гэта спісвалася ў адходы і вывозілася на звалку. Тытунь у нас не расце, уся сыравіна прывазная. Адзін кілаграм тытуню даражэй за тры кілаграмы цукру. А цяпер нашы рацыяналізатары вырашылі прапарваць, размякчаючы гэту сумесь. Паколькі на лісцях тытуню ёсць пясок і іншыя цяжкія прыродныя наносы, усё гэта ў працэсе ферментацыі асядае на дне спецыяльных барабанаў, а прапараная тытунёвая маса прапускаецца пад ціскам праз фармовачныя адтуліны, як вермішэль. Потым сушыцца ў выглядзе дробных кавалачкаў-вермішэлін і ідзе ў вытворчасць. Атрымліваецца чысты маланікацінавы тытунь.

Салдаты засталіся задаволеныя. Памежнікі пацікавіліся творчай кухняй пісьменнікаў і паэтаў. «Асноўнай скарбніцай пісьменніка, — патлумачыў Васіль Уладзіміравіч, — з'яўляецца памяць. Проста не ўсе могуць, а часам не хочуць знайсці патрэбны матэрыял у гэтым сховішчы. Для паўнаты прамоўленага дадам, што часта даводзіцца карыстацца архівамі, сустракацца са сведкамі падзей».

Пасля сустрэчы мы выйшлі на вуліцу Лермантава. Васіль Быкаў жыў тады на Алега Кашавога. Перш чым звярнуць да сябе, Васіль Уладзіміравіч раптам спытаў, ці не мяне сустракае гэта прыгожае стварэнне, што прытаілася ля дрэва? Я прыгледзеўся і ўбачыў за таполяй на павароце вуліцы сваю жонку. Паколькі мы жылі зусім побач з клубам, яна выйшла мяне сустракаць. «Давярай, але правярай», — усміхнуўся пісьменнік.

Аднойчы, завітаўшы ў рэдакцыю «Гродзенскай праўды», я ўбачыў пачырванелага, «у поце» паэта Сяргея Бандарэнку, які сядзеў за вольным сталом і штосьці шаптаў сам сабе. Павітаўшыся, я паклаў на стол Быкава два свае новыя вершы. Васіль Уладзіміравіч уважліва прачытаў іх. Адну рукапісную старонку адразу паклаў у сваю працоўную папку, другую аддаў на дапрацоўку: трэба замяніць літаральна пару слоў. Мне няцяжка было гэта зрабіць, і я заслужыў пахвалу ад Быкава. А Бандарэнка ўсё яшчэ спрабаваў знайсці патрэбныя словы для сваіх твораў. Я спытаў, ці магу паглядзець на вершы калегі свежым вокам і нешта параіць. «Праўку сваіх твораў пажадана рабіць самому аўтару. Нічые словы не заменяць аўтарскай думкі», — заўважыў Васіль Уладзіміравіч. Каб згладзіць маю збянтэжанасць, ён усміхнуўся рэдкай, добрай быкаўскай усмешкай. З тых часоў заўсёды стараюся сам шліфаваць свае вершы.

У 1964 годзе Саюз пісьменнікаў Беларусі запрасіў мяне ўзяць удзел у двухтыднёвым семінары маладых аўтараў. Аднак сямейныя абставіны не дазволілі мне паехаць: нарадзілася дачка, і я не мог надоўга пакінуць жонку з дзіцём. Васіль Уладзіміравіч тады вельмі бедаваў. Казаў, што я трачу шанц стаць адным з аўтараў калектыўнага зборніка, а заадно і атрымаць пуцёўку ў Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага ў Маскве, пра які я тады марыў.

У сэрцы многія гады захоўваю пахвалу Васіля Быкава на адной з вечарын паэзіі. Тады ён голасна сказаў: «У Вас, Віктар, выдатныя вершы, меладычныя, музычныя. Лёгка ўспрымаюцца душой і сэрцам, як быццам усё гэта адбываецца з тым, хто чытае. Пішыце болей!» І я стараўся апраўдаць яго давер.

Віктар КУЦ

(Публікацыю падрыхтаваў Мікола МІКУЛІЧ)

Конкурс «УРОКІ СУЧАСНАСЦІ»

НЕ ЗАХВАРЭЦЬ НА АБЫЯКАВАСЦЬ

Урок пазакласнага чытання ў 8 класе па аповесці Валерыя Гапеева «Ведзьміна тоня»

Апошнім часам праблема сіроцтва стала надзвычай актуальная. У большасці выпадкаў сірата сёння — гэта дзіця, якое страціла бацькоў па сацыяльных прычынах. Павелічэнне колькасці сацыяльных сірот абумоўлена не столькі эканамічнымі, колькі сацыяльнымі і псіхалагічнымі фактарамі.

Праблемы дзяцей, якія страцілі бацькоў, ва ўсе часы выклікалі асаблівы клопат з боку дзяржавы, грамадства, царквы. Беларускія пісьменнікі таксама неабыякавыя да лёсу гэтых дзяцей.

Твор Валерыя Гапеева на першы погляд — пра прыгоды сучасных падлеткаў, таямніцы Ведзьмінай тоні, загадку гібелі чатырох аднавяскоўцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Аднак пісьменнік не менш захапляльна расказаў гісторыю Сяргея, які вырас у дзіцячым доме. Хлопчык рана пасталеў, быў вымушаны думаць пра кавалак хлеба не толькі для сябе, але і для малодшай сястрычкі Нэлы, бо п'янай маці не было справы да дзяцей. На жаль, такія гісторыі не рэдкія цяпер, і падлеткі бываюць сведкамі таго, як іх аднакласнікі пры жывых бацьках аказваюцца ў прытулках ці дзіцячых дамах.

Аповесць В. Гапеева «Ведзьміна тоня» вучыць і дзяцей, і дарослых быць спагадлівымі, несці маральную адказнасць за свае ўчынкі.

Арыгінальнасць урока.

Перад пачаткам заняткаў неабходна падрыхтаваць палоскі паперы (трох розных колераў, па 30 — 40 кожнага колеру), 3 — 4 вялікія аркушы паперы, клей.

Паведамляецца тэма і мэта ўрока. Падрыхтаваўшыся, вучні знаёмяць клас з асобай пісьменніка, яго творчай біяграфіяй, дэманструюць фотаздымкі. Затым група вучняў прэзентуе буктрэйлер да аповесці *(https://youtu.be/apm0o96Emy8)*.

Для праверкі засваення зместу твора настаўнік прапануе віктарыну. За правільны адказ вучні атрымліваюць каляровую пазнаку на парту.

Пытанні віктарыны:

1. «Чорнае люстэрка свабоднай вады, на выгляд неверагодна халоднай нават у спякотны дзень. Калі залезці на якую алешыну, дык зверху яна выглядае раўнюткім кругам, а вада ў ёй — яшчэ чарней». Пра якое гіблае месца ішла размова?

2. «...стаяў тут раней лес, а сярод гэтага лесу быў хутар. Жыла ў ім жанчына, вядзьмарка. І гэтак яна многа шкоды нарабіла людзям, што Бог не стрываў, і ў адну ноч праваліўся гэты кавалак лесу пад зямлю». Хто расказваў дзецям гэтую гісторыю?

3. «Ні з кім не размаўляў, твар ад людзей хаваў. Адкуль ён і хто — не ведалі. Некалькі дзён бясшумна яго лодка слізгала па чорнай вадзе. А аднойчы ён не паказаўся. Толькі лодку гумавую, пустую, без вёслаў прыбіла бліжэй к зіме да Заікінага вострава». Пра каго расказваецца?

4. Хто дае такую характарыстыку галоўнаму герою: і вочы ў Сяргея «зладзеяватыя», і ўвогуле ён «бандыт бандытам», «бязбацькаўшчына», ад якога «што хочаш чакаць можна», і «ваўчанё ён сапраўднае», і «каланіяй ён закончыць»?

5. Сяргей песціў сваё «незабыўнае пачуццё». «Яно было заўсёды, мо з самага першага дня яго жыцця, яно не знікала ніколі, яно толькі спала разам з Сяргеем і прачыналася разам з ім». Пра якое пачуццё гаворыць аўтар?

6. Якім чынам хлопчык набыў рэпутацыю «злодзея» і бандыта?

7. «Яго выхаванне больш нагадвала звычайную дрэсіроўку якога-небудзь звярка — ён біў дзяўчынку, калі тая не слухалася, і даваў кавалачкі хлеба, калі яго каманды выконваліся». Пра каго ідзе размова?

8. «Толькі ты, сын, — бацька гаварыў, выдзяляючы кожнае слова, — памятай адну простую рэч: сіла апраўдваецца толькі у двух выпадках. Першы — бароняць сваё жыццё. Другі — бароняць слабога. Трэцяга не дадзена». Каму былі адрасаваны гэтыя словы?

9. «— Цьфу ты, як проста, — Сяргей адчуў незвычайную палёгку. Рукі вось толькі крыху трымцелі, зубы вілаў чапляліся за зямлю, але ўжо праз хвілін пяць праца пайшла спорна». Што аказалася такім простым для Сяргея?

10. Сяргей вырашае жыць згодна са сваім правілам. Што гэта за правіла?

Настаўнік зачытвае словы В. Гапеева, якія запісаны на дошцы ў якасці эпіграфа: «Цвёрда перакананы, што няма дзіцячых праблем. Ёсць праблемы ў нашых дзяцей. І яны перажываюцца імі настолькі ж балюча, як і мы перажываем свае. Гэта і хочацца данесці да чытача: і юнага, і сталага».

Пытанні да класа:

Якія праблемы хвалююць вас, сённяшніх падлеткаў?

Якія праблемы хвалявалі Сяргея — галоўнага героя аповесці?

Хто такі сірата?

Якія беларускія пісьменнікі пісалі пра дзяцей-сірот?

Аналіз аповесці «Ведзьміна тоня». Метад «Дыванок ідэй». Вучні працуюць у групах.

На першым этапе вучні ў групах адказваюць на праблемнае пытанне: *Ці можна Сяргея назваць сіратой? Чаму ён, маючы дом і сям'ю, жыве ў дзіцячым доме?* Кожная група атрымлівае 10 каляровых палосак і вялікі аркуш паперы. Заданне для групы: адказаць на пастаўленае пытанне, напісаць адказы на атрыманых палосках паперы (на адной палосцы — адзін адказ, пры гэтым неабавязкова выкарыстоўваць усе палоскі), а пасля зрабіць на вялікім аркушы паперы «дыванок», наляпляючы ўсе палоскі такім чынам, каб адказы лёгка чыталіся. Пасля заканчэння работы групы прадстаўляюць свае «дыванкі» і зачытваюць адказы, робяць выснову па праблеме.

Другое пытанне: *Нэла і Сяргей атрымалі надзею, што ў іх будзе сям'я. Што дапамагло героям у вырашэнні іх праблемы?* Кожная група зноў атрымлівае 10 каляровых палосак паперы (іншага колеру) і запісвае свае ідэі, а пасля зачытвае класу. Новыя палоскі прыклейваюцца да «дыванка». Робіцца вывад: добрых людзей значна больш, чым злых і чэрствых. Трэба быць сумленным і шчырым, тады і да цябе паставяцца адпаведна.

Трэці этап — індывідуалізацыі дзеянняў. Кожны адказвае на пытанне: *Што асабіста я магу зрабіць, каб не было побач такіх абяздоленых і няшчасных дзяцей, як Сяргей і Нэла?* Адказы запісваюцца на палосках паперы. Групы чытаюць адказы па чарзе. Калі ў іншай групе ёсць такая ж ідэя, яна адкладаецца ў бок. Настаўнік бярэ палоскі з прачытанымі адказамі і клеіць іх на дошку. Калі ідэі вычарпаны, настаўнік просіць групы прыклеіць пакінутыя палоскі да сваіх «дыванкоў» і павесіць іх на сцяну.

Настаўнік зноў звяртаецца да эпіграфа і прапануе паразважаць, якія праблемы былі ў герояў твора. Ці ўдалося аўтару данесці гэтыя праблемы, іх важнасць?

Работа з выказваннямі ў групах. Настаўнік просіць прачытаць выказванні і выбраць адно, якое адпавядае тэме заняткаў і якое вучні выбралі б у якасці эпіграфа, абгрунтаваць свой выбар, а затым наклеіць выбраны групай эпіграф у верхнім правым куце сваіх «дыванкоў».

Выказванні:

1. Там, дзе недалёка абыякавасць, там недалёка пагібель (Кузьма Чорны).

2. Самая страшная рэч — абыякавасць. Калі з ёй не змагацца, яна, як багна, можа загубіць любога чалавека (Максім Танк).

3. Адносіны да дзяцей — беспамылковая мера духоўнай годнасці чалавека (Янка Брыль).

4. І ад таго, як прайшло дзяцінства, хто вёў дзіця за руку ў дзіцячыя гады, што ўвайшло ў яго розум і сэрца, з таго, што вакол яго, — ад гэтага ў большай ступені залежыць, якім чалавекам стане сённяшняе дзіця (Васіль Сухамлінскі).

5. Дзеці, якіх не любяць, стануць дарослымі, якія не могуць любіць (Перл Бак).

Удзел вучняў у занятках. Вучні доўга рыхтаваліся да заняткаў. Дзеці самі выбралі заданні да ўрока: нехта рыхтаваў паведамленні, шукаў матэрыял і фотаздымкі ў бібліятэцы. Група вучняў рыхтавала буктрэйлер, доўга падбіралі музыку. Колькасць налепак, атрыманых за правільныя адказы, улічвалася пры выстаўленні адзнак.

Вынікі. Дзякуючы аповесці В. Гапеева многія вучні задумаліся над сваёй будучыняй, над тым, якімі яны будуць бацькамі. Твор навучыў чалавечнасці і адказнасці. Метад «Дыванок ідэй» дазволіў перайсці ад аналізу праблемы да вызначэння індывідуальных дзеянняў. Вучні спрачаліся, адстойвалі свае думкі, вучыліся аргументаваць. Новы метад дапамог правесці ўрок нестандартна, дзеці шмат рухаліся, вучыліся працаваць у групе.

Валянціна ГЕНЬ,
настаўніца Пагародзенскай сярэдняй школы Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці,
фота аўтара

АдмыСлова

Калісьці беларускія пісьменнікі, якія выдатна ўсведамлялі ролю мовы ў працэсе фарміравання самабытнай нацыянальнай культуры, заснавалі ў літаратурна-мастацкім часопісе «Узвышша» адмысловую рубрыку пад назвай «Культура мовы». Тлумачачы неабходнасць з'яўлення гэтай рубрыкі, узвышаўцы зазначалі: *«Мова — адзіны матэрыял, з якога пісьменнік будуе свае творы. Калі пісьменнік не ўладае патрэбнай колькасцю гэтага матэрыялу, калі ён дасканала не ведае асаблівасцей гэтага матэрыялу і спосабаў злучэння паасобных яго частак, дык, напэўна, яму не ўдасца збудаваць моцнага і прыгожага твора»* (Узвышша. 1927. № 5. С. 194).

З таго часу мінула больш за дзевяноста гадоў, многае ў нацыянальнай культуры змянілася: месца роднай, першай засвоенай, напраўду матчынай мовы заняла мова вывучаная, якая сталася вынікам свядомага дарослага выбару. І над гэтай мовай нам пастаянна трэба працаваць, развіваць і ўдасканальваць яе, каб паспяхова адказваць на выклікі часу.

Давайце рабіць гэта разам!

Чытаючы найноўшую беларускую літаратуру, мы будзем звяртацца да моўных хібаў, якія адцягваюць увагу ад зместу твора, замінаюць атрымліваць ад тэксту асалоду.

Найбольшая колькасць моўных хібаў, якія трапляюцца на старонках беларускамоўных тэкстаў, праяўляецца на лексічным і граматычным узроўнях і тлумачыцца тым, што аўтар пад уплывам рускай мовы аддае перавагу русізмам ці несвядома ўжывае рускія граматычныя канструкцыі, насычаючы тэкст іншароднымі элементамі.

Глебай для роздуму ў першым выпуску нашай рубрыкі стала адна з аповесцей, апублікаваная летась у часопісе «Полымя». Звернемся да прыкладаў.

Возьмем тыповы для гутарковага маўлення сказ: *«Ты не збіраешся, **выпадкам**, сёння ў горад?»*. У ім мы маем справу з класічным калькаваннем рускага *«случаем»*. Заўважым, што слова *«выпадкам»* фіксуецца «Тлумачальным слоўнікам беларускай літаратурнай мовы», выдадзеным у 1999 годзе, зрэшты, як і слова *«карандаш»*, што не робіць іх беларускімі. Чым замяніць гэтае слова, каб сказ загучаў па-беларуску больш натуральна? Напрыклад, словам *«дарэчы»*, якое мае тое самае значэнне: *«Ты, дарэчы, не збіраешся сёння ў горад?»*

Разгледзім яшчэ колькі прыкладаў ужывання русізмаў: *«Ну, не ўсяму напісанаму трэба верыць, — Кухар паклаў сшытак у папку, узяў другі, **пераліснуў** яго старонкі, уздыхнуў…»*. У гэтым сказе кідаецца ў вочы русізм *«пераліснуў»*, які наогул не фіксуецца беларускімі слоўнікамі. Замест яго варта ўжыць дзеяслоў *«перагарнуў»*.

Альбо такі сказ: *«Аднак тая ад пацалунка ўхілілася, што **некалькі** азадачыла і засмуціла хлопца»*. Пакінуўшы ўбаку дылему *«азадачыла»* ці *«збянтэжыла»*, разбяром некарэктнае ўжыванне слова *«некалькі»*. Арганічна па-беларуску гэтае слова выглядае толькі ў ролі няпэўна-колькаснага лічэбніка: *некалькі кніжак, некалькі дзяцей*. Для іншых выпадкаў існуюць беларускія прыслоўі *«крыху»* ці *«трохі»*: *«…што крыху азадачыла* (ці ўсё ж збянтэжыла?) *і засмуціла хлопца»*.

Возьмем яшчэ адзін прыклад: *«Ён нават падняў галаву, пашукаў вачыма ў празрыстым блакіце журавоў, аднак неба было чыстае, нават аблокаў у гэты час на ім не было **бачна**»*.

У гэтым сказе ўвагу прыцягвае безасабова-прэдыкатыўнае прыслоўе «бачна», логіка з'яўлення якога ў беларускай мове дастаткова празрыстая: «видеть» — «видно», значыць, «бачыць» — «бачна». Каб абеларусіць гэты сказ, варта замест прэдыкатыва «бачна» ўжыць дзеяслоў «відаць»: *«…нават аблокаў у гэты час на ім не было відаць»*.

Звернемся да некалькіх прыкладаў уплыву рускіх сінтаксічных канструкцый на беларускую мову. Возьмем сказ *«Хачу запытацца ў цябе па сакрэце…»*, дзе не зусім карэктна ўтворана словазлучэнне з дзеясловам «запытацца», які ў беларускай мове ўжываецца без прыназоўніка, і паправім яго: «Хачу *запытаць цябе* па сакрэце…»

Разгледзім яшчэ адзін класічны прыклад беларускіх-рускіх сінтаксічных гібрыдаў: *«Ты ж збіраўся ажаніцца на ёй!»*. Варта памятаць, што беларусы, у адрозненне ад рускіх, *«жэняцца»*, *«бяруць шлюб»*, *«бяруцца шлюбам»* **з** кімсьці: *пабрацца шлюбам з каханым, узяць шлюб з калегай, ажаніцца з аднакласніцай.*

Працяг будзе.

Марына КАЗЛОЎСКАЯ,
кандыдат філалагічных навук, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Ліцэя БДУ

ДУХМЯНЫ ЖЫВАПІС,

альбо Як намаляваць пах кавы?

Жывапіс са смакам кавы. Менавіта так можна ахарактарызаваць праект студэнткі Акадэміі мастацтваў Алесі Ісы, прадстаўлены ў сталічнай кавярні «*Guru Coffee Club*». Выбар прасторы невыпадковы: канцэптуальны праект аб'яднаў партрэты сталічных барыста. Праз іх вобразы мастачка паказвае, што гэтая праца — сапраўднае чараўніцтва, працэс, што чапляе візуальнай эстэтыкай і нават пахам.

Усе героі — людзі творчыя і тэмпераментныя, што адлюстравана ў карцінах. Яны аб'яднаныя залатымі тонамі. Менавіта гэты колер асацыюецца з духмянай кавай. Работы поўняцца гарманічнымі адценнямі і смелай пабудовай кампазіцыі.

— Я вельмі люблю піць каву. Заходжу ў кавярні практычна кожны дзень. У нейкі момант стала заўважаць, што ў іх працуюць вельмі цікавыя і прыгожыя людзі, — расказвае Алеся Іса. — Пераадолеўшы страх, у 2013 годзе я падышла да дзяўчыны, якая працавала ў кавярні недалёка ад майго дома, і прапанавала ёй папазіраваць. Пасля гэта ператварылася ў традыцыю: я прыходжу ў кафэ, знаёмлюся з барыста, запрашаю стаць мадэллю. Так у мяне нараджаліся не толькі партрэты, але і добрыя чалавечыя стасункі з цікавымі людзьмі. У пачатку 2018 года я зразумела, што партрэтаў назапасілася шмат, вось і прыйшла ідэя аб'яднаць іх адной выстаўкай.

Але асновай для канцэпцыі праекта стала не толькі тэматыка, але і выбар месца для яго прадстаўлення: творца знайшла кавярню з неабходным для яе работ інтэр'ерам. Такім чынам, сувязь паміж кавай, барыста і кавярняй захаваная. Наогул, гэта ўжо асобны трэнд, калі мастацтва выходзіць за межы выставачных пляцовак у памяшканні самай рознай функцыянальнай накіраванасці з вялікай колькасцю наведвальнікаў.

— Стала заўважаць, што ў галерэі, на вялікі жаль, ходзіць не так і шмат людзей. Вядома, ёсць тыя, хто прыходзяць мэтанакіравана, але як далучаць да мастацтва іншых? Выходзячы з канцэпцыі сваіх твораў, я знайшла месца, у якім арганічна падала жывапіс. Мне захацелася, каб любы чалавек мог прыйсці, паглядзець работы, пракаментаваць, магчыма, пакрытыкаваць. Для самога гледача размяшчэнне карцін у кафэ таксама палягчае задачу: не трэба траціць грошы на квіткі, і ў зале, дарэчы, няма бязмежнай цішыні. Можна прыйсці ў кавярню на спатканне альбо на сустрэчу з сябрам і ў той жа час разам пазнаёміцца з жывапісам таго ці іншага мастака. Прыемнае з карысным.

Алеся Іса жадае атрымаць як мага больш водгукаў, каб зразумець, каму яе творчасць цікавая, а каму ўвогуле не падабаецца.

— Я не баюся масавага густу. Мне нават цікава, як людзі з розных сфер будуць рэагаваць на маю творчасць. У любым выпадку глядацкі суд — гэта досвед, асабліва для маладога мастака, — падкрэслівае творца. — Насамрэч не так лёгка, будучы маладым творцам, заявіць пра сябе. Прызнаю, што магчымасць арганізацыі праектаў у масавых установах — шанц для маладых мастакоў прыцягнуць да сябе ўвагу. Прычым неабавязкова зацікаўліваць толькі жывапісам, можна рабіць, напрыклад, мастацка-музычныя вечары або праводзіць экскурсію па выстаўцы, распавядаючы аб стварэнні экспазіцыі, раскрываючы гісторыю месцаў, якія ў ёй фігуруюць. З аднаго боку, гэта прыемна і карысна мастаку, з другога — установа таксама ў плюсе: хтосьці ў любым выпадку застанецца выпіць кавы ці возьме кубак з сабой падчас агляду экспазіцыі.

Акрамя партрэтаў, на выстаўцы прадстаўлена і некалькі пейзажных твораў. Мастачка вырашыла разбавіць імі экспазіцыю, каб прадэманстраваць, што яна можа працаваць у розных жанрах. Дарэчы, творца актыўна цікавіцца гістарычнымі тэмамі. Неаднойчы пісала партрэты знакамітых беларускіх дзеячаў. Зараз мастачка вучыцца на шостым курсе Акадэміі мастацтваў па спецыяльнасці «Станковы жывапіс». Яе дыпломнай работай будзе партрэт прадзеда — знакамітага беларускага паэта Аркадзя Куляшова.

— Я вельмі спантанны чалавек, ствараю эмоцыі. Ніколі не магу прадказаць, што захачу напісаць у наступны момант, — дзеліцца Алеся. — Сёння гэта барыста, заўтра можа быць князь Вітаўт.

А калі зусім шчыра, то ўсе мае творы — зборны вобраз мяне самой. Уся мая сям'я вельмі творчая. Думаю, ад іх мне дасталася такая моцная энергетыка. Праз іх я заўсёды напаўняюся эмоцыямі. Калі выхоўваешся сярод музыкі, сярод літаратуры, фарміруешся дзякуючы гэтаму як асоба, не можаш уявіць сябе пасля без творчых складнікаў жыцця.

Мастачка ўпэўнена: калі бесперапынна жывеш сваёй справай, любіш яе, сам не заўважаеш, як табою пачынаюць цікавіцца. Наперадзе ў яе шмат задум, напрыклад, арганізаваць экспазіцыю партрэтаў дзеячаў культуры Беларусі.

Вікторыя АСКЕРА

Жыццё: загадка і рэальнасць, поўная мар і надзей...

«Феміністычныя гульні», 2014 г.

Цудоўная і непараўнальная па глыбіні выстаўка жывапісу «Гульня сноў» Алены Шлегель працуе ў Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў. Прадстаўленыя палотны дэманструюць унікальны сінтэз філасофскіх роздумаў, канцэпцый і ідэй, пададзеных у своеасаблівай форме міфа, казкі, легенды.

Адштурхоўваючыся ад рэалістычнага спосабу мастацкага выяўлення, аўтар гарманічна дапаўняе яго элементамі дэкаратыўнасці, якія спрыяюць паглыбленаму і ўсебаковаму раскрыццю алегарычных сэнсаў твораў. У гэтым дачыненні вялікую ролю адыгрывае колер, які, у залежнасці ад кантэксту, набывае характэрнае сімвалічнае значэнне. Яркі, імпульсіўны, сакавіты, ён захоўвае пульс жыцця, выступаючы важным элементам пэўнай гісторыі. Самадастатковасць і цэласнасць, уласцівыя героям карцін Алены Шлегель, раскрываюцца дзякуючы тонкасці псіхалагічных сітуацый, у якія змешчаны чалавек. Любоў, флірт, жыццёвыя перыпетыі — галоўныя рухавікі ў многіх палотнах мастачкі.

Аднак не трэба шукаць у іх толькі псіхалагічны падтэкст. Створаныя ў форме гульні, яны ўвасабляюць лепшыя праявы тых эмоцый і пачуццяў, якія здольныя змяніць знешні і ўнутраны свет чалавека, садзейнічаць духоўнаму ўзбагачэнню асобы.

Вобраз мары, вытанчаны і элегантны, у якасці нязменнага лейтматыву гучыць ва ўсіх творах, разнастайных па мастацкім змесце. Карціны Алены Шлегель нельга аднесці да пэўнага кірунку з прычыны іх сэнсавай поліфанічнасці і змястоўнасці. Сама мастачка тлумачыць асаблівасці ўласнай творчасці з пазіцый так званага куртуазнага рамантызму, які ўвасабляецца ў арыстакратычнасці духу і пікантнасці ва ўзаемаадносінах герояў. Алегарычнасць назваў твораў раскрывае іх глыбокі філасофскі падтэкст, які захаваны ў гісторыі і міфах.

Міфалагічным пачаткам авеяны твор «Малочныя рэкі» (2004), у якім вялікае значэнне адводзіцца сакральнай трактоўцы зместу. Кожная выява тут сімвалічная: так, напрыклад, малако яшчэ з даўніх часоў атаясамлівалася з вітальнасцю, дастаткам і пладавітасцю жанчыны, выступаючы алегорыяй адраджэння і бессмяротнасці.

Крыху з іншых пазіцый разглядаецца вобраз жанчыны ў карціне «Юдзіфь» (2009). У адпаведнасці з біблейскім зместам, яна часта паказвалася майстрамі розных эпох мужнай, моцнай духам ваяўніцай. У творы Алены Шлегель яна, наадварот, «прыгожая выглядам і вельмі прывабная позіркам» (Юдзіфь, 8:7). Асаблівай пікантнасцю і неардынарнасцю вылучаецца палатно «Феміністычныя гульні» (2014), у якім знайшлі адлюстраванне дваістасць чалавечай натуры, наяўнасць у кожным суб'екце мужчынскага і жаночага пачатку, барацьба супрацьлегласцяў і пошук гармоніі паміж імі.

Поўныя гармоніі, палотны Алены Шлегель грунтуюцца на хісткасці памежных станаў, дзе рэальнасць сумяшчаецца са сном, праўда — з вымыслам, каханне — з ілюзіяй. Карціны мастачкі ўяўляюць сабой космас, які атачае чалавека і гучыць унутры яго.

Ксенія СЯЛІЦКАЯ-ТКАЧОВА,
мастацтвазнаўца, культуролаг

Струменістая тканіна пачуццёвасці,

альбо Ці можна ў пагоні за таямніцай не загубіць сапраўднае каханне?

Тонкая, лёгкая шаўковая тканіна так пасуе еўрапейскім модніцам. І каб яны працягвалі наталяцца гэтай прыгажосцю, некаму трэба пакінуць Францыю і праехаць праз паўсвету. Эрвэ Жанкур разумее, што бізнес таго варты, і дзеля яго едзе ў Японію, каб на месцы далучыцца да таямніцы шоўку. Яму трэба здабыць і прывесці ў Францыю грэны шаўкапраду. Ён разумее, што шлях доўгі і няпросты. Праз усю Еўропу, Расію, возера Байкал, якое мясцовыя жыхары называюць морам. А дома чакае адданая жонка Элен, да якой павінен вярнуцца. І ён яшчэ не ведае, якую галоўную таямніцу давядзецца разгадаць у выніку сваёй шаўковай эпапеі.

Папулярны раман італьянскага пісьменніка Аляксандра Барыко перанёс у сцэнічную прастору Беларусі Аляксей Ляляўскі. Спектакль «Шоўк» прыйшоў у Беларускі дзяржаўны тэатр лялек некалькі гадоў таму, а потым знік з афішы. А цяпер адноўлены, з некаторымі зменамі. Аднак прынцыпова рэжысёрскае рашэнне засталося першапачатковым: гэта драматычная гісторыя, якая распавядаецца акцёрамі-людзьмі. Лялькі адыгрываюць тут бадай што дэкаратыўную функцыю: яны выкарыстоўваюцца хутчэй дзеля нейкай умоўнасці (бо ўсё ж такі сам тэатр — лялечны) альбо працуюць на мастацкае рашэнне, метафарычна падкрэсліваючы тэму і асаблівасць прасторы, у якой існуюць усе героі пастаноўкі. А гэта жыхары Захаду і Усходу. Мы ў XIX стагоддзі. Захад па-дзелавому стрыманы, бізнесмены без залішніх эмоцый, якія робяць грошы, купляючы і прадаючы, мітусяцца, заклапочаныя справай, — Эрвэ адзін з іх, такі ж прагматычны, дакладна ведае, што яму трэба. Ці можна чакаць ад такога чалавека віру эмоцый?.. Але ёсць Усход, дзе не робяць лішніх рухаў, не гавораць непатрэбных слоў, але кожная дэталь, погляд, жэст, напоўненыя значэннем, дыхаюць пачуццёвасцю, якая, нібыта павуцінне шаўкапраду, аплятае волю французскага камерсанта.

Эрвэ ў нейкі момант нібыта губляе грунт, існуе ў адарваным стане, ахінуты тонкімі і чароўнымі пачуццямі, нібыта струменісты шоўк. У гэтым была ці не самая складаная задача для рэжысёра, які раман-бестселер прадставіў праз сцэнічныя сродкі за якія дзве гадзіны. У такіх выпадках заўсёды ёсць рызыка, што нешта можа выслізнуць (як тканіна), нейкія лініі ці эпізоды прыйдзецца апусціць, і гэта зразумела. Ляляўскі вызначыўся з тым, што галоўнае, каб раскрыць гісторыю Эрвэ Жанкура, — яе распавядае і сам герой, і некалькі іншых персанажаў. І рэжысёр дакладна разумее, што галоўнае ў гэтым творы. А яшчэ ён вызначыўся з тым, што павінна быць галоўным у спектаклі, каб прадставіць раман Барыко.

Атмасфера.

Герой, з'язджаючы ў далёкую Японію, трапляе ў вір пачуццёвасці. Купляючы шаўкапрад, у доме гандляра ён сустракае чароўную прыгажуню з тварам дзяўчынкі,

якая авалодвае ўсімі яго думкамі, не сказаўшы ніводнага слова. Нібыта тая гронка, яна паселіцца ў яго свядомасці і спляце з тонкіх міццяў тканіну нерэальнага пачуцця, якое ахіне героя, прымусіць жыць толькі гэтымі вандроўкамі ў Японію і марыць пра Яе.

Дома чакае надзейная Элен. Яна таксама марыць пра шчасце. Але Элен побач заўсёды, яна такая… звычайная. А тая далёкая жанчына ў чырвоным кімано з дзіўным тварам не ідзе з галавы, вабіць, прымушае зноў ехаць праз усю Еўропу і Расію і яшчэ далей, усё дзеля прывіднай надзеі на новую сустрэчу. Убачыць яе, здаецца, нерэальна, не тое што спядзявацца на дакрананне…

Жарсць кіруе героем — і, здаецца, з яе вырастае моцнае пачуццё. Толькі такое пачуццё можна паказаць умоўна-цнатліва, як гэта робіць рэжысёр у сцэне ўмывання: яе дотыкі, але нібыта і не яе (у такое цяжка паверыць!) — таму ў гэтым моманце ўдзельнічае некалькі актрыс. Але мы задагадваемся, якая гераіня тут галоўная. Яе прыцягненне прымусіць яго зноў прыехаць у Японію і перажыць трагедыю. Падштурне яго дамагацца расшыфроўкі ліста з чароўнымі — такімі пачуццёвымі і шматабяцальнымі — іерогліфамі.

Японская тэма задае стыль усёй пастаноўцы, нават еўрапейскай яе частцы (што лагічна, бо галоўны герой жыве ў плыні тых эмоцый). У першую чаргу — рытмам, які абраны для пастаноўкі: манатоннасць музычнай тэмы (аўтар Ягор Забелаў) стварае ўражанне гукавой павуціны, якая ўплятае гледача ў спектакль, нібыта ў кокан. Гэты вобраз угадваецца ў постацях іншых жанчын, што з'яўляюцца на сцэне, ён і ў масках, якія абазначаюць некаторых герояў, якія так ці інакш спрыяюць развіццю жарсці Эрвэ. Ці ўплывае на гэта зачараванасць яго Японіяй наогул (?) — яе глядач адчувае праз цудоўную анлайн-графіку, тонкую, празрыстую, малюнкі якой хочацца лавіць у спалучэнні з тэкстам, які прамаўляюць артысты. Сцэнаграфія мастачкі Таццяны Нерсісян стрымана-вытанчаная, без пераборaў і надта прамалінейных дэталяў, падкрэслівае стан герояў, уцягвае ў іх перажыванні і прымушае адчуваць і марыць разам з імі. Спачатку гэта ўражвае нават самой вынаходлівасцю сцэнаграфічнага рашэння, потым чаруе прыхаванай рамантыкай, вытанчанасцю саміх кадраў, якія мяняюць адзін аднаго на экране, далей захапляе арганічным спалучэннем з усёй дзеяй: не дазваляе перасягнуць мяжу, калі лёгкі налёт эратызму балансуе на ўзроўні здагадак і адчуванняў. І нават калі ведаеш спектакль, усё адно ён захоплівае, бярэ ў палон пачуццём, пра якое разважаеш.

ЯНО растворана ў паветры, ідзе ў залу, вярэдзіць уяўленне і накладваецца (ці дастае знутры, абуджае) уласныя перажыванні гледачоў. І ЯНО не адпускае ў фінале, калі пагоня за пачуццёвасцю ператвараецца замерлым коканам — у згубленае пучуццё. Каханне, якое было зусім побач. Яно ціха і цярпліва чакала, магло ўсё зразумець і нават падтрымаць ілюзію, без якой каханаму было цяжка, і яно гатовае было перажыць нават смерць.

Эрвэ зразумеў пра яго галоўнае, калі страціў. А мо менавіта тады і адкрыў яго ў сабе?

Ларыса ЦІМОШЫК

ЯК ПЯСОК СКРОЗЬ ПАЛЬЦЫ

Колазвароты часу ў родных дварах

Пачаць варта са шчасця. Што гэта такое? Калі ў дзяцінстве ездзіш на ровары ды наўмысна звальваешся ў лужыну; калі можна быць малпачкай ды лазіць па яблынях; калі катаешся на тарзанцы; калі скокаеш у пясок… Але ведаеце, якое шчасце галоўнае? Мець дом. І ў дадзеным выпадку дом — гэта не бяздушная будыніна з дарагімі сэрцу сценамі. Дом — гэта пачуццё, калі хочаце, філасофія. Пра гэта пісаў яшчэ Францыск Скарына, бо дом — гэта «месца сілы», якое зберагае ўспаміны. Менавіта гэтую думку даносіць у спектаклі Маладзёжнага тэатра «Двор, як натура, што сыходзіць» рэжысёр Таццяна Аксёнкіна.

Спектакль паставілі па п'есе расійскага драматурга Алены Ісаевай (па некаторых звестках яна — вучаніца Вазнясенскага), і для рэжысёра, якая досыць часта стварае пастаноўкі для ненапружанага прагляду (хоць у яе скарбонцы ёсць і чароўны спектакль «Саня, Ваня, з імі Рымас»), «Двор…» — гэта спроба зрабіць простую, немудрагелістую гісторыю сапраўднай філасофскай прыпавесцю, якая б пакінула жаданне разважаць, а не была звычайнай забавай на адзін вечар. Увесь калектыў тэатра таксама на гэта працаваў — нездарма ж трупе Маладзёжнага далі званне «Заслужанага калектыву», якое акцёры цалкам апраўдваюць (чаго толькі вартая мужнасць адной з актрыс, якая іграла прэм'ерны спектакль са зламанай рукой). Выконваць ролі артыстам было хоць і няпроста, але вельмі прыемна: героі п'есы Ісаевай — гэта людзі, каштоўныя тым, што захоўваюць у сабе эпоху.

Саша-Пелікан (Яўген Іўковіч) цяпер ужо дарослы мужчына, нават паспяховы: жыве ў Аўстраліі, валодае землямі ў краіне кенгуру ды займаецца любімай справай — матацыкламі. Але яго маці захварэла, і ёй вельмі захацелася вярнуцца на радзіму, пабачыць, якой стала Масква за доўгія гады яе адсутнасці. Калі герой-аўстраліец аказваецца ў сучаснай Маскве, ён ужо не мае гэтага адчування дома, які калісьці быў для яго ўсім: паўсюль гандлёвыя цэнтры, людзі спяшаюцца на працу; машыны і хмарачосы. Але памяць на тое і існуе, каб захоўваць дарагія моманты і людзей, якія калісьці былі блізкімі. Так, Сашка сустракае свайго сябра дзяцінства Генку (Сяргей Шаранговіч) — каля месца, дзе калісьці знаходзіўся іх дом № 33 па вуліцы Зялёнай. З гэтага моманту пачынаецца падарожжа герояў ва ўспаміны, настальгія па былых сябрах ды каханых.

Таццяна Аксёнкіна паказвае сваіх герояў вельмі рознымі — часам наіўнымі, часам сур'ёзнымі, але ўсе яны чуллівыя, ім складана быць няшчырымі і хочацца стаць шчаслівымі, і гэта тое, што персанажаў аб'ядноўвае. Дарэчы, дарослыя Сашка ды Генка — усяго толькі назіральнікі за тым, якімі яны былі ў мінулым. Вось ім па чатырнаццаць: Сашка пераязджае з сям'ёй у той самы 33-і дом на Зялёнай, знаёмства з Генкам пачынаецца з бойкі. Наогул, усё нейкае нешчаслівае: п'яны сусед, бабка Ліда, якая штораз нагадвае, што хлопца ў гэтым доме нічога добрага не чакае, дзед-ветэран, які штодня нагадвае пра перамогу ў вайне, самотная дзяўчына, якая будзе шукаць сабе мужа. Спектакль цікавы ўжо тым, што на пытанні дома, адносінаў, кахання адказы шукаюць адразу тры пакаленні людзей. Адказы ў іх будуць розныя.

Але ці не ў гэтым сэнс? У 14 дом — гэта толькі памяшканне, бацькі — людзі, якія не пускаюць на вечарынкі, каханне — бесклапотныя абяццані «назаўсёды». У 40 усё змяняецца: дом становіцца сімвалам устойлівасці, утульнасці, бацькі займаюць меншае месца ў жыцці, а вось каханне — яго ці няма, ці яго шукаеш, ці бясконца змагаешся за яго. Напэўна, самыя шчаслівыя ў любоўным плане старыя: дзед Лёня ўгаворвае бабу Ліду падзяліць з ім старасць, а яна не пагаджаецца, бо ў жыцці пабачыла рознага і цяпер не гатовая да такіх эксперыментаў. Часам ва ўсіх гэтых перыпетыях згадваюцца сюжэты п'ес Вампілава: гэткая ж «бытавуха», пачуццёвасць, складаныя адносіны, непаразуменні ды пошукі шчасця. Аксёнкіна ў спектаклі прасочвае цыклы жыцця і закальцоўвае іх (для гэтага на сцэне нават ёсць пляцоўка-кола, якая рухаецца разам з жыццём герояў), напаўняе жыцці герояў сэнсамі, шукае арыенціры, якія б адпавядалі ўзросту персанажаў. І шмат увагі надае мінуламу, бо менавіта на ім усё завязана: цяперашняе жыццё — гэта люстра таго, што было калісьці; усе ўчынкі, якія былі зробленыя ў дзяцінстве, цяпер справядліва адбіваюцца на чалавеку; усе правільныя і няправільныя рашэнні ўплываюць на тое, якім жыццём героі жывуць цяпер.

Двор у такім выпадку — гэта адначасова

і проста дэкарацыя да разважанняў, і вельмі глыбокая рэч. Што тут ёсць? Колькі лаў, старое дрэва ды ўваход у пад'езд. Але калі задумацца, то менавіта тут прымаліся тыя самыя жыццевырашальныя рашэнні, тут хлопцы ішлі сценка на сценку, тут Генка спрабаваў прызнацца ў каханні дзяўчыне, а Сашка маляваў партрэт сваёй самай сапраўднай любові Надзькі. У сінопсісе спектакля нездарма напісана, што двор — гэта філасофія. І гэта так, двор — навука, якая дае не толькі тэарэтычныя веды ад дзеда Лёні пра вайну ды ад бабкі Ліды пра забабоны, але і практычныя, якія пасля сфарміруюць характар жыхароў двара.

Часам дзіцячая наіўнасць персанажаў ды іх рашэнняў збівае гледача з панталыку: спектакль пачынае падавацца банальнай меладрамай з жартамі ніжэй за пояс ды наогул без глыбокіх думак, але менавіта складаная гісторыя, якую распавялі проста, дае больш важкі вынік: вялікае — у малым, трэба разумець гэта, калі вядзеш пошукі. Усе надзённыя рэчы, бытавыя дробязі, спрэчкі ды кінутыя проста так фразы маюць вялізнае значэнне ў глабальным плане. Вось пра гэта кажа неідэальны, немудрагелісты, але прыязны ды лёгкі «Двор…».

Маргарыта ДЗЯХЦЯР

СВАБОДНЫЯ АДНОСІНЫ

Дакументаліст Кацярына Махава пра адказнасць перад гледачом

За плячыма гэтай дзяўчыны — некалькі гадоў працы на «Беларусьфільме», некалькі стужак, знятых на студыі Іаана Воіна, і шэраг складаных тэм, на якія аўтар разважае ў фільмах, створаных метадам назірання. Кацярына Махава распавяла пра архаічныя традыцыі Палесся, растлумачыла, чаму рэжысёру часам лепш прамаўчаць, каб выратаваць сваё кіно, і дала параду тым, хто хоча стаць дакументалістам.

— Кацярына, ці згодны вы з тым, што дакументальнае кіно — справа не жаночая?

— Усё змяняецца, цяпер жанчын-рэжысёраў вельмі шмат, і яны здымаюць выдатнае кіно! Калі я вучылася ў Акадэміі мастацтваў, выкладчыкі казалі, што дакументалістыка — справа не жаночая, ёсць такое стэрэатыпнае стаўленне. Мне ўсё ж падаецца, што рэжысура — у першую чаргу адмысловае мысленне, не кожная жанчына можа так разважаць ды факусавацца. Бо здымкі прымушаюць рэжысёра «выпасці з жыцця», кудысьці з'язджаць, гэта вельмі самастойная прафесія, дзе кінематаграфіст бярэ на сябе адказнасць. Таму я б не казала, што гэта менавіта не жаночая справа, — усё залежыць ад канкрэтнага чалавека, наколькі ён можа вытрымаць такія выпрабаванні. Што датычыцца падзелу на жаночае і мужчынскае, то часам нават кіно, знятае мужчынам, можа ўспрымацца як жаночае. Як прыклад — некаторыя стужкі Аляксея Германа, яны вельмі тонкія.

— Вашыя стужкі закранаюць складаныя тэмы: героі аказваюцца ў цяжкіх абставінах. Ці лёгка з такімі тэмамі працаваць?

— Тэмы, звязаныя з асаблівымі дзецьмі, з'явіліся ў маім жыцці выпадкова, я іх не шукала. Узаемадзеянне з сябрамі ды знаёмымі, што працавалі з такімі дзецьмі, у выніку прывяло да таго, што я пачала здымаць — з'яўлялася ўнутраная патрэба, хацелася распавесці чыюсьці гісторыю, як у выпадку з «Дзіцём і дэльфінам». У гэты момант кіно перастае быць проста тэмай, бо я паглыбляюся ў гісторыю, заўважаю дробязі, стаўлю сябе на месца герояў. Зразумела, у такіх сітуацыях мне складана хаваць эмоцыі, мы перажываем усёй здымачнай групай, герой «Дзіцяці і дэльфіна» Максім пужаўся займацца ў дэльфінарыі, доўга не хацеў узаемадзейнічаць з дэльфінам, і гэта было складана. І я суперажывала, але разумела, што трэба рабіць сваю працу. Але мне складаней якраз пасля здымак, бо ў працэсе рэжысёр не адзінокі: ёсць здымачная група, адчуваецца падтрымка, усе па іншы бок камеры, а пасля застаешся сам-насам з матэрыялам.

— Фільмы здымаеце ў форме назірання. Чым вам такі падыход цікавы?

— «Няхай жыве Маленькі прынц» — гэта прыклад сінтэзу назірання ды камунікацыі, але, сапраўды, часцей за ўсё я выкарыстоўваю прынцып назірання, бо гэты метад дазваляе лепш адлюстраваць сутнасць быцця. Калі чалавек у кадры разняволены, проста пражывае моманты, заняты сваёй справай, а камера гэта фіксуе, то на экране ў выніку будзе рэальнае жыццё, бо камера тут не дамінуе, пра яе забыліся. У той жа час здымкі метадам назірання пакідаюць шмат свабоды для рэальнасці, ты ніколі не ведаеш, што будзе, то-бок, сюжэт адкрыты, і мне гэта вельмі падабаецца! Мне не блізка, калі ўсё прадказальна, не блізка, калі з героямі працуюць як з акцёрамі, не блізка лезці да герояў з пытаннямі, бо часам словы могуць зруйнаваць кіно. Я спрабую мінімалізаваць свой удзел, і, мяркую, так кіно атрымліваецца больш сапраўднае.

— Вы не раз адзначалі, што цікавіцеся архаічнымі традыцыямі Палесся, нават знялі трылогію на гэтую тэму...

— Мае сувязі з Палессем пачаліся каля 10 гадоў назад, я паехала туды здымаць фільм «Коліш» пра бабуль, якія захоўваюць традыцыю спеваў. Там пазнаёмілася са скульптарам, героем майго наступнага фільма. Стужка «Званар» завяршыла гэтую палескую трылогію. Так сталася, што фільмы выліваліся адзін у другі: мяне сапраўды крануў дух Палесся, ён амаль страчаны, таму першая карціна і называецца «Коліш», што значыць «калісьці». Раней традыцыі палешукоў былі ўплеценыя ў жыццё, а нам усё гэта дасталася ў менш натуральнай форме. Уразіла, што на кожны выпадак жыцця ў жыхароў тых мясцін знаходзілася песня, а людзі, якія сталі маімі героямі, захавалі дух менавіта той эпохі. Зараз магу сказаць, што любоў да Палесся ў мяне засталася, але гэтая тэма — ужо не адкрыццё, я супакоілася і збіраюся рухацца ў іншым напрамку.

— Як рэжысёр-дакументаліст ідзе на кантакт з героямі?

— Мяне прымалі вельмі натуральна на Палессі, з героямі наўпрост не трэба было працаваць, яны пагаджаліся адразу. Многія дакументалісты, якія здымаюць кіно ў правінцыі, адзначаюць, што там здымаць прасцей, чым у горадзе, бо жыхары глыбінкі не думаюць пра камеру, пра тое, як яны выглядаюць, прымаюць рэжысёраў і самі сабе тлумачаць, што гэта проста праца. Важна, каб паміж мной і героямі ўсталёўваўся давер, таму часта я спачатку езджу да «акцёраў» адна, без камеры, проста прысутнічаю ў іх жыцці, каб гэта набыло нейкую звычку.

Кадр з фільма «Дзіця і дэльфін».

Падчас здымак вельмі шмат маўчу: героі ўжо да мяне прывыклі, і цяпер я не павінна адцягваць іх увагу на сябе.

— Сцэнарый для дакументальнага кіно — рэч эфемерная, а што з тэмай? Яна застаецца аднолькавая ў пачатку здымак і пасля?

— Тэмы фільмаў глабальна застаюцца на месцы, але яны могуць пашырацца. У мяне здаралася такое: пачынала здымаць стужку пра падлеткавы перыяд у школе, размаўляла з настаўнікам, хацела ўзяць у якасці героя яго, а ў выніку асноўным героем стаў хлопчык, менавіта праз яго я максімальна раскрыла тэму і крыху змяніла глабальную сутнасць стужкі. Я б параўнала працу рэжысёра з мастаком, рэалізм якога не заўсёды аказваецца «рэальным»: яны павінны вывучыць бэкграўнд, спачатку прывязацца да чагосьці, а ўжо потым змяняцца разам з сітуацыяй. Падобная сітуацыя была ў фільме «Званар», калі жонка галоўнага героя трапіла ў шпіталь, хоць, зразумела, гэтага не планавалася, а пад сітуацыю трэба было падладжвацца. Таму пра сцэнарый казаць не даводзіцца — у мяне ёсць схематычны план, у які жыццё ўносіць карэктывы.

— Вы кажаце, што здымаеце аўтарскае кіно. Можаце растлумачыць, што гэты тэрмін значыць для вас?

— Мяркую, што аўтарскае кіно — у першую чаргу асабістае выказванне. Форма тэхнічна складаная, але калі гэта сапраўдная думка, то яна і будзе аўтарскай. Можна сказаць, што аўтарскае — гэта яшчэ і кіно з почыркам, калі яго можна пазнаць. Але датычна мяне, не ведаю, ці выпрацаваўся пазнавальны стыль, бо мае стужкі адрозніваюцца адна ад адной па падыходзе. Часам я ахвярую некаторымі рэчамі, звязанымі са зместам фільма, больш увагі надаю форме, а бывае — наадварот. Стужка «Няхай жыве Маленькі прынц» для мяне наогул эксперыментальная: я размаўляла са сваімі героямі. І адчуваю жаданне не заставацца на месцы і працаваць з адной формай, а, наадварот, здзіўляць, у тым ліку і сябе.

— Ці ёсць рэжысёры, стужкі якіх вас натхняюць?

— Днямі пераглядала стужкі Пеляшана. Я б сказала, што гэта ўжо класіка, і яна мне падабаецца, нягледзячы на тое, што я здымаю зусім іншае кіно. Мне вельмі падабаецца галандскі рэжысёр Ёрыс Івэнс, асабліва стужка «Гісторыя ветру», гэта яго апошняя карціна, цікава зробленая — з пастаноўкай, з рэжысёрам у кадры: у нейкія моманты перастаеш адчуваць мяжу паміж дакументалістыкай і гульнёй. Для мяне больш цікавыя і блізкія аўтары, якія ствараюць кіно, адрознае ад майго. Складана сказаць пра беларускае кіно. Яно мяне вельмі ўражвала, калі я вучылася ў акадэміі. Памятаю, што падчас вучобы пазнаёмілася з Валерыем Рубінчыкам. Мяне ў той час вельмі захаплялі яго фільмы. І менавіта іграваое кіно я думала здымаць сама, але пасля пераглядзела ўласныя погляды і вызначылася, што хачу займацца дакументалістыкай. У многім дзякуючы стужкам Зоі Катовіч, Віктара Аслюка, Галіны Адамовіч, Міхаіла Жданоўскага. Зараз сачу за дакументалістамі, якія выбіраюць свой шлях: Дзмітрыем Махаметам, Андрэем Куцілам, Юрыем Цімафеевым.

— Для вас першаснае ўласнае выказванне ці меркаванне гледача?

— Мяркую, калі штосьці робіцца шчыра, калі гэта цябе кранае, то менавіта такія ж пачуцці будуць і ў астатніх. Зразумела, што гэта не догма, бо кіно — заўжды рызыка. Рэжысёры, якія зашмат думаюць пра гледача, у выніку могуць атрымаць адваротную рэакцыю. У аўдыторыі таксама ёсць выбар, гэта свабодныя адносіны — можна сысці з кінатэатра, можна наогул туды не прыходзіць. Таму для мяне рэжысура — гэта мастацкая форма, і калі я выказваюся, то думаю ў першую чаргу ўласна пра мэсадж, бо мастак нікому нічога не павінен.

— Што самае складанае ў дакументальным кіно?

— Уласна для мяне самае складанае — пачатак здымак, новы фільм. Таму што даводзіцца «вынырваць» з сябе, са свайго жыцця, і першы час ёсць адчуванне, што рухаешся не ў патрэбным напрамку, вельмі хвалюешся і сутыкаешся з рэальнасцю. У нашай краіне далёка не паўсюль, не ва ўсіх арганізацыях цябе чакаюць, і пачынаеш думаць: «А што далей?». Складана ў працэсе здымак знаходзіць мяжу, якую не хочацца перасякаць у адносінах з героямі фільма, наколькі далёка можна пайсці менавіта з гэтым чалавекам, бо я шаную яго асабістую прастору, унутраны свет. Шмат маіх герояў — людзі ў цяжкіх абставінах, хворыя. Для мяне гэта вельмі складаныя моманты, у кіно шмат пераходаў. А вось калі пачынаецца мантаж, надыходзіць ступень супакаення.

— Вашыя стужкі атрымлівалі ўзнагароды на «Лістападзе», «Залатым Віцязі», паказваліся на «Артдакфэсце». Прызнанне патрэбна?

— Для дакументалістаў, якіх я ведаю і хто ў прафесіі доўга, узнагароды мелі сэнс у пачатку кар'еры. Пасля гэта перастае неяк уплываць наогул, хоць маральна дапамагае, бо прафесія ў нас складаная, і калі бачыш узнагароду, то разумееш, што праца выкананая добра і яна патрэбная. Нядаўна мы знялі кіно «Перазімаваць» пра старых людзей, якія зімуюць разам у доме сезоннага пражывання. На кінафестывалі «Артдакфэст» пасля паказу некаторыя гледачы казалі мне, што фільм вельмі цяжкі. Прызнанне мае карціны атрымліваюць цяпер толькі за мяжой — у Беларусі іх паказваюць вельмі рэдка, і нават гэтыя паказы атрымліваюцца стрэсавымі, мне даводзіцца ледзьве не апраўдвацца. За мяжой звычайна поўныя залы, паважлівае стаўленне да аўтара фільма, і гэта дае сілы рухацца далей. А ўласна поспех у выглядзе статуэтак ці дыпломаў для мяне другарадны.

— Як дакументалісту рэалізавацца ў Беларусі сёння?

— Фінансавы бок пытання я не бяру, бо ніколі не ўдзельнічала ў пітчынгах, здымала кіно на студыях, а зараз — самастойна, толькі спрабавала атрымаць падтрымку кінематаграфічнага фонду, але не склалася. Таму адзіная парада — здымаць, незалежна ад таго, ці ёсць падтрымка. Дакладна магу сказаць, што ў Беларусі быць кінематаграфістам складана, я 2 гады запар езджу на «Артдакфэст» і бачу такое адрозненне ад нашых фестываляў: там ёсць моц выказвання, няма самацэнзуры. Унутраная свабода для рэжысёраў проста неабходная, таму яе трэба ці адраджаць ці хоць бы знаёміцца.

— На ваш погляд, чаму айчынная дакументалістыка недаацэненая грамадствам?

— Пытанне складанае і балючае. Памятаю, як прыйшла на працу на студыю «Летапіс» і даведалася, што некаторыя стужкі Міхаіла Жданоўскага збіралі ў савецкі час поўныя залы ў кінатэатрах. Што здарылася? Не магу сказаць. Магчыма, гэта ідзе ад кінастудыі, мабыць, ад грамадства. Цяпер людзі наогул не ведаюць, што існуе студыя «Летапіс», што здымаецца дакументальнае кіно, што яно бывае рознае. Справа, зразумела, і ў адсутнасці рэкламы, паказаў, хоць нейкай інфармацыі, адкуль можна даведацца пра дакументалістыку. Некалькі гадоў таму на адзін з паказаў дакументальнай праграмы «Лістапада» прыйшоў толькі адзін глядач, а на першы паказ «Няхай жыве Маленькі прынц», які быў асветлены ў медыя досыць шырока, прыйшло больш за сто чалавек, што для айчыннай дакументалістыкі — сапраўдная перамога.

Маргарыта ДЗЯХЦЯР

На сваёй струне

ЧАТЫРЫ КАРАЛЕЎНЫ

Тайны і дары

Ларыса СІМАКОВІЧ,
кампазітар

«…быццам усе чатыры каралеўны, падзеленыя, але счэпленыя паміж сабой, сталі адной адзінай рукой…»

Клім Палін

Яны сышліся нядаўна — чатыры экспрэсіі — чатыры Каралеўны, асобы з адметным характарам і яркім абліччам. Эмацыянальныя, маладыя, таленавітыя, яны ўвайшлі ў новы склад Мінскага струннага квартэта Белдзяржфілармоніі і распачалі новы этап у гісторыі камернага мастацтва краіны. У катэгарычна жаночым складзе — як першая трава вясной…

Як першая трава вясной, з'явіліся і першыя рэцэнзіі-водгукі. Першыя замежныя гастролі — Люксембург — някепскі для пачатку горад. Старыя, сярэднявечныя, адзінаццатага стагоддзя муры Абацтва цяпер утрымліваюць гучанне і айчыннага струннага квартэта.

Выпрабаванне на зладжанасць і кемлівасць у пазаштатных сітуацыях прынеслі квартэту прызнанні ў замілаванні з боку заслужанай артысткі Расіі Святланы Сцепчанкі падчас апошняга Міжнароднага фестывалю «Уладзімір Співакоў запрашае» ў Мінску.

Некаму такі шанс выпадае гады ў рады. Мінскаму струннаму квартэту пяро ўдачы само легла пад ногі. Сольная праграма заслужанай артысткі Расіі Святланы Сцепчанкі прадугледжвала ўдзел струннага квартэта. «Паабяцалі тутэйшых музыкантаў, — распавядае Святлана Сцепчанка. — Якім жа неверагодным і радасным было маё здзіўленне ад сустрэчы з Мінскім струнным квартэтам! Мне не давялося, як гэта часта бывае, "тлумачыць музыку". Нам было дастаткова "дамовіцца аб агульных намерах!" Сумесны выступ на філарманічнай сцэне — незабыўны падарунак — шчырае і адкрытае сяброўства надоўга».

ТАЙНА КАРАЛЕЎНЫ ВІЯЛАНЧЭЛІ

Некалі хвалюючую прыгажосць гучання віяланчэлі не заўважылі ні Бах, ні Гайдн, ні Моцарт… Наша Каралеўна з выбарам не памылілася. Яе інструмент адпавядае яе каралеўскаму статусу. Голас віяланчэлі ўладарыць не толькі ў межах свайго дыяпазону, але і ў гукавым уладарстве альта і скрыпкі.

Шлях Ганны Царовай па жыцці і музыцы толькі пачынаецца. Яна бессаромна таленавітая і маладая. Гук яе віяланчэлі з неабсяжнымі магчымасцямі ператвараецца з неабдымна-касмічнага ў тужліва-бездапаможнае *lamento* чалавечага голасу. Так інструмент спаборнічае з загадкавасцю самой Ганны. Духоўная прыгажосць і чысціня, як гэта часта бывае, няўмольна пераходзяць на знешняе аблічча. Гарачыню тэмпераменту ахалоджваюць апушчаныя веі. Чысціня, якую прадыктавала інтуіцыя цела, забяспечыла лёгкае прыняцце вегетарыянства.

Далёкае мігценне барочных афектаў вось-вось раскрые тайну Каралеўны. Тэмпы жыцця імклівыя, бедаваць няма калі.

Барочны вакал — бурлівая гарачая крыніца. Вакал эпохі барока з характэрнай і спецыфічнай гукападачай, утварэннем вакальных фіярытур і фантастычных віртуозных віражоў — рупенне Ганны Царовай.

Што гэта? Запозненае захапленне? Прымха-капрыз здольнага чалавека? А чаму не? Захапленне — статусная прывілея. Капрыз — адмыслова каралеўскі. Позна? Не пазней моманту сур'ёзнага вывучэння барочнага вакалу ў Акадэміі «Санта-Чэчылія» 17-гадовай Чэчыліі Барталі, чыё дараванне дапамаглі раскрыць Герберт фон Караян, Даніэль Барэнбойм і Нікалаус Арнанкур. Гісторыя сяброўства італьянскай спявачкі і сусветна вядомых дырыжораў падае знак-сімвал нашым — беларускім амбіцыйным дырыжорам. Чаму б на зямлі каралёў і магнатаў, палацаў і замкаў не спраўдзіцца гэтаму пакаралеўску элегантнаму і высакароднаму сюжэту, настолькі ж вартаму ўчынку вышэйназваных дырыжораў, як адкладзеныя дырыжорскія палачкі дзеля ролі акампаніятараў маладой Барталі на яе сольных канцэртах? Ланцуг падзей вызначыць новы парадак. Вядома, дырыжорамі не становяцца, а нараджаюцца. Іх каралеўская схільнасць да татальнага падпарадкавання сваёй волі дасць шанц займець новую яркую музычную гісторыю ў айчыннай культуры… А пачатак увасаблення — вось вам! — асоба Уршулі Радзівіл з жыццём перабольшанага тэатра, звышмернай раскошы і закаханага чакання.

ТАЙНА КАРАЛЕЎНЫ ВІЁЛЫ

Глыбіня стрымлівае. Стрыманасць — першае папярэджанне аматарам лёгкай даступнасці. Стрыманая прырода віёлы (альта) бянтэжыла самых вызнаных. Той, хто спасцігаў тайну яе гучання, асмельваўся на адчайную дзёрзкасць: стварэнне оперы без выкарыстання скрыпак, як гэта зрабіў Эцьен Мэюль у оперы «*Uthal*», аддаўшы перавагу высокага эмацыянальнага гучання выключна альтам.

У Каралеўны Віёлы Алены Прановіч дзве слабасці. Каралеўская стрыманасць кампенсуецца глыбокая схаванай цікаўнасцю да лацінаамерыканскіх танцаў і вандровак. Рытмы абвастраюць гумар і іронію, кандэнсуюць радасць. Танец — рэдкі эфект адначасовага ўзбуджэння і супакаення.

Танцаў было мала, а вось вандровак у Алены — звышдастаткова. Захапляльныя гастрольныя ўражанні ад Еўропы былі пераможаны адчувальным жахам ад знаходжання ў Паўднёвай Карэі. Жах ад раптоўнай пазнавальнай рыфмы з уласным жыццём на радзіме. Ад забітасці і зацюканасці простага народа, яго рабскага паслухмянства і адсутнасці хоць якога парывання самастойна разважаць і ладаваць сваё жыццё з сябе, незалежна ад рэжыму. Мабільныя тэлефоны — уласнасць цывілізаванага чалавека — былі забраныя пры выхадзе з самалёта. Экскурсіі строга дазаваныя: ад аглядання мёртвага цела ў маўзалеі адмовіцца і падумаць нельга.

Праяўленая самастойнасць пазнаёміцца з вячэрнім Пхеньянам катэгарычна не віталася: выйсці з гатэля было немагчымым: цябе вяртаюць, назад у гатэль. Вокны дамоў — аднолькава шыза-шэрыя. Дзе-нідзе — да болю знаёмыя «лямпачкі Ільіча». Піянеры. Нязменна спалоханыя твары мужчын і жанчын. Ні з кім ні пазнаёміцца, ні загаварыць: суцэльны невынішчальны страх. Такое жыццё ўражвае мацней, чым вольны дух Еўропы, дзе высокі ўзровень і якасць жыцця даўно пазбаўленыя неабходнасці ў доказах. Ён проста ёсць. У ім жывуць. Не задумваючыся. Пра свабоду не разважаюць. Яна паўсюль. У паветры, у стылі паводзін гараджан, у агульнай разняволенасці і радаснай празе жыцця. Калі знясілены Закон маўчыць (паводле Ёзафа Гёрэса), у сферы Прыгожага самаўтвараецца кодэкс высакародства. Розніца істотная: прыгажосць заваблівае рытмам, закон — сілай.

ДАРЫ КАРАЛЕЎНЫ ДРУГОЙ СКРЫПКІ

Перад выявай прыгажуні скрыпкі на адной з карцін 1503 года вялікага Рафаэля спынілася ў задуменні гісторыя. Майстар абмежаваўся выявай. Стагоддзі схілілі галовы перад яе гучаннем — непераадольны палон.

У Каралевы Другой Скрыпкі Валянціны Навуменкі — рэдкае захапленне. Рэдкі дар слыхам «счытваць» музыку любой складанасці і пераносіць яе на ноты. Рэдкая здольнасць апроч нот «счытваць» стыль, жанравыя асаблівасці, прыкметы і адметнасці музычных эпох. Зайздроснае майстэрства прыстасавання фактуры арыгінала да тэхнічных магчымасцяў абранага інструмента альбо ансамбля. Джаз — амерыканскі і еўрапейскі, музыка Сярэднявечча, музыка эпохі Рэнесансу не губляе хараства і якасці, набыўшы ўвасабленне ў іншых ансамблевых спалучэннях.

Захапленне падобна да зіхоткай гульні — лёгкай і не натужлівай, як гульня ў бісер. Тонкія пальцы («*...мне па тонкіх тваіх пальцах вечнасці лічыць гады…*» Гётэ) ствараюць мініяцюрныя карціны-паштоўкі — светлага тону летняе неба, зімовыя пейзажы, легкакрылыя ціхамірныя анёлы, што ночаць побач з кранальнымі карункамі аранжыровак айчыннага фальклору. Гукі — што бісер — упарадкаваная паслядоўнасць мелодыі. Глыток чыстай вады… І як не згадаць Арыстоцеля: «Дасканаласць — не дзеянне, а звычка…»

КАРАЛЕЎСКІ ІМПЕРАТЫЎ ПЕРШАЙ СКРЫПКІ

Гісторыя зрабіла ўсё, каб жанр камернай музыкі набыў самы высокі іерархарычны статус сярод інструментальных жанраў. Складанае, не кожнаму вуху даступнае, поліфанічнае існаванне пры абсалютнай роўнасці права на першынства забяспечыла жыццяздольнасць жанру і няспынную эвалюцыю. Гайдн пісаў квартэты, і яны адразу ж выконваліся. Моцарт, схіляючыся ў вучнёўскім рэверансе перад настаўнікам і кампазітарскім геніем Гайдна, прысвячаў яму свае квартэты і дасканаліў жанр. Бетховен выйшаў за межы салонаў і апынуўся ў космасе.

Музычнай размовай чатырох разумных асоб называюць струнны квартэт. Разважанне як працэс, абмежаваны знешняй афектацыяй. Цэнтр увагі — сэнс, глыбіня і змест.

Канцэрт для выканаўцы — выпадзенне з агульнага парадку. Шчаслівым яго не назавеш, — занадта нервовае (*tremolando*) чаканне вячэрняга выхаду на сцэну. Няшчасным — таксама. Верагоднасць вышыні, прадчуванне іншасвету, якога душа музыканта, можа, як ніякая іншая, прагне, бо — як тут быць? — ранішняя раса на траве на пачатку дня ніколі не высыхае… І чаго тут больш: жахлівага трымцення ці прадчування шчасця?

Новыя дарогі вабяць далячынню… Спакушаюць сцежкі торныя. Палохаюць — непракладзеныя. Непаўторнасць патрабуе намаганняў. Што абраць? Як спалучыць «узнёслае і зямное»? Як улагодзіць слых, што лечыць стомленую ад пошукаў сугучнасці душу? А недзе ў вышынях б'ецца пульсам зорка, пакуль невядомай і нябачнай музыкай: яна распавядзе нечаканае, павядзе за край звычайнага і — хто ведае! — адамкне глыбіні, пра якія і падумаць не мог. Паслядоўнасць не выключае выпадковасці, фрагментарнасць не парушае завершанасці. Кожная падзея нібы адчыняе дзверы туды, дзе ніколі не быў, бясконцая анфілада набліжае да самога сябе, існага, сапраўднага. А складаны працэс робіць заўважным стваральны характар.

Акрэслены разлік параметраў: «*Будучыню нельга забараніць*». Час для перамен на дзіва спрыяльны. Стомленасць сістэмы ад самой сябе і сваёй знябытасці. Гістарычныя дэкарацыі няўмольна мяняюцца — дзверы адчыненыя, заслона расхінутая. Новая эпоха не абыходзіцца без новых імёнаў. Дзёрзкія, непрадказальныя і рызыкоўныя ўсталёўваюць свае крытэрыі, свае хуткасці. Яны пацвярджэнне няспыннай эвалюцыі.

Як звінець невыпадковай струной, выцінаць з яе срэбныя яскі-іскры і спыніцца там, дзе самадасканаласць памкнецца змяніцца самазамілаваннем? У мастацтва дакладны адрас — наша душа. У яго работа такая: даць нам шанц пазбавіцца ад абцугоў абмежаванасці. «Быць творцам — не значыць вынаходзіць бессэнсоўныя камбінацыі, быць творцам — значыць ствараць неабходнае, якога менш» (А. Пуанкаро).

Ролі другога плана не ўласцівы Каралеве Першай скрыпкі Кацярыне Мішчанчук. Ад яе голасу залежыць: будзе музычнае жыццё струннага квартэта толькі эпізадычным інтэрмецца ў партытуры асабістага жыцця ці стане з'явай у музычнай культуры краіны.

Шлях, што ляжыць наперадзе, вабіць множнасцю варыянтаў: можна балансаваць паміж акадэмічнымі стандартамі, элітарнасцю, даступнасцю і збянтэжана-ціхай сучаснасцю.

Можна ўсё жыццё здаваць іспыты: «Зірніце, я магу! І так, і гэтак!». Можна набыць сіндром несупыннага доказу сваёй прафесійнай годнасці і цягнуць тое ярмо праз усё жыццё.

Можна абраць бяспройгрышны рэпертуар — трывіяльны набор класічнай папулярнай музыкі і быць «не горшым за іншых».

Можна той жа самы «набор» — палінялыя ад часу партытуры — выконваць так, быццам гучаць яны ўпершыню.

Можна зайсці на тэрыторыю, дзе ніхто не быў, і набыць славу Магелана.

Можна абраць самы цяжкі шлях — стаць нацыянальна-арыентаваным калектывам — не блукаць па чужых пушчах, а каласіць сваю ніву: нечаканы рэпертуар створыць новую ідэнтычнасць.

Можна ўсё. Нельга толькі без рызыкі ствараць мастацтва.

А метафарычным эпіграфам мог бы стаць прывітальны заклік Чэслава Мілаша з роду Мілашаў, спадкаемцаў славутых Сапегаў: «Хадземце, павяду вас у край дзівосаў, сутоння імглы і ціхіх шэптаў. Адзін узмах крыла — і мы паляцім над краінай, дзе ўсе рэчы пазначаны прыгалосым колерам успамінаў. Нас агортвае пах гарлачыкаў, імшастая лясная смуга, млявае бледнае неба задуменнага краю, што адкрываецца перад намі, хаваючы ў сабе ўсю свежасць позірку старавечных плямёнаў».

30 сакавіка на сцэне Малой залы імя Р. Р. Шырмы — сольны канцэрт Мінскага струннага квартэта. Першы ў новым складзе. З яго пачынаецца новая старонка гісторыі квартэта. Напоўнены даверам, прыйдзе свой слухач: па непадманную радасць.

Паролі да твораў

Гісторыі пра Беларусь: жаночы погляд

Ала Кушнер «Лядзенскі манастыр», 2009 г.

Мастацтвазнаўцы адзначаюць, што жанчыны-мастачкі прэтэндуюць на асобную пазіцыю ў сучаснай творчасці. Яны па-асаблівому адчуваюць навакольны свет, таксама як і адлюстроўваюць яго. Бывае, складана ўявіць, якім чынам яны змаглі ўлавіць настолькі тонкія рысы прыроды альбо скрозь хмурныя тоны ўбачылі лініі святла. На мінулым тыдні ў Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адбылося адкрыццё сумеснай выстаўкі жывапісу і графікі «Паралельныя гісторыі» мастачак Алы Кушнер, Наталлі Каржыцкай, Наталлі Шапавалавай, Марыны Канавалавай, Юліі Нявейкі. Творцы заклікаюць гледача падабраць правільныя паролі да іх творчасці і раскрыць свет вобразаў.

Юлія Нявейка «Песня сірэны», 2018 г.

Назва выстаўкі першапачаткова дае зразумець, што ў экспазіцыі прадстаўлена некалькі гісторый. Сапраўды, кожная жанчына робіць акцэнт на розныя складнікі нацыянальнай культуры. Адной цікава паказаць гісторыю, другой — перадаць дух малой радзімы. Мастачкі супрацоўнічаюць шмат гадоў. Яны разам ездзяць на пленэры, удзельнічаюць у экспазіцыях. Усе яны розныя, аднак паспелі стаць згуртаваным калектывам.

— Пачалося з таго, што мы пазнаёміліся з адным з аўтараў выстаўкі — мастачкай Наталляй Шапавалавай — і дамовіліся правесці яе персанальную выстаўку, — расказвае дырэктар галерэі «Універсітэт культуры» Павел Сапоцька. — Але выстаўка доўга адкладалася. Як мы жартуем сёння, напэўна, яна чакала свайго часу. Ідэя персанальнага праекта трансфармавалася ў калектыўны. У выніку выстаўка атрымалася менавіта такой: характарызуе мастачак. Па-першае, яна энергетычна жаночая, а па-другое, вельмі цёплая, а гэтага нам так не хапае ў марозным сакавіку. Выстаўка, безумоўна, набыла іншае гучанне за кошт змянення канцэпцыі: было прынята рашэнне жывапіс разнастаіць акварэллю і графікай.

Наведвальнікі галерэі засталіся ўражаныя ад пейзажаў Марыны Канавалавай, нацюрмортаў Наталлі Каржыцкай. Публіка падоўгу затрымлівалася каля партрэтаў Юліі Нявейкі, разгадваючы ў намаляваных вобразах аўтарскую задуму. Сапраўды, спатрэбяцца гадзіны, каб зразумець, наколькі ўважліва мастачкі выбудоўваюць кампазіцыі, наколькі адказна ставяцца да слова, якое адгукаецца ў фарбах і адценнях.

— Нашы аўтары — выхаванцы розных не толькі ўстаноў адукацыі, але і розных школ, — адзначае Павел Сапоцька. — Усё ж такі віцебскі мастграф, педагагічны ўніверсітэт і кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Універсітэта культуры і мастацтваў — абсалютна не падобныя адна на адну школы. У кожнай — свае методыкі выкладання. У нашых мастачак праглядаецца адметнае бачанне прыроды, фарбаў, структуры жывапісу. На цырымоніі адкрыцця праекта мастацтвазнаўцы адзначылі, што кожная з гэтых жанчын можа пахваліцца сапраўдным майстэрствам, паколькі кожная ведае, як паказаць сваю культуру, як захаваць традыцыі і не страціць іх унікальнасць. Пераважаюць на выстаўцы матывы прыроды. У Юліі Нявейкі, напрыклад, — вобразы з беларускай міфалогіі. Ёсць выявы старажытных беларускіх храмаў. Для галерэі важна, што экспазіцыя выстаўкі закранае гісторыка-культурныя аспекты.

Самі мастачкі задаволеныя, што атрымалася ўпісацца ў агульную прастору і не перашкаджаць адна адной у сэнсавым спалучэнні.

Праект стаў стартам для арганізацыі іншых сумесных выставак, мерапрыемстваў, звязаных з пытаннямі папулярызацыі айчыннай гісторыі. Хутка лета, а гэта значыць, што магчымасцяў выязджаць у розныя мястэчкі Беларусі будзе больш.

Вікторыя АСКЕРА

Спадчына

ПАЯДНАЎ МАЛАРЫЦКІ СТРОЙ

Валянціна Струнец (злева направа), Святлана Луцык, Ала Назарук, Людміла Сакалюк у стылізаваных маларыцкіх строях.

Сумесны беларуска-ўкраінскі праект «Народная творчасць без межаў» стаў адным з пераможцаў Праграмы тэрытарыяльнага супрацоўніцтва краін Усходняга партнёрства «Беларусь — Украіна». На яго рэалізацыю Еўрапейскі саюз вылучае 98,5 тыс. еўра, з іх больш як 59 тыс. прызначана беларускаму боку. Ініцыятарам праекта выступіў аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Маларыцкага райвыканкама, партнёрам — аддзел адукацыі, па справах моладзі і спорту Ратнаўскай раённай дзяржаўнай адміністрацыі Украіны.

А вось ідэя адрадзіць і развіць традыцыі рэгіянальнага ткацтва на тэрыторыі беларуска-ўкраінскага памежжа ўзнікла на базе досведу, назапашанага Маларыцкім раённым цэнтрам народнай творчасці, прыярытэтны кірунак дзейнасці якога — захаванне рамяства ткацтва. Дзякуючы стараанням народнага майстра Рэспублікі Беларусь Сцепаніды Сцепанюк, майстрам народных рамёстваў Але Назарук, Святлане Луцык і Людміле Сакалюк удалося ўзнавіць старадаўную ткацкую тэхналогію «кажушком».

— Чаму для нашых спецыялістаў так важна вывучыць маларыцкі касцюм? — разважае дырэктар Маларыцкага раённага цэнтра народнай творчасці Валянціна Струнец. — У першую чаргу з-за яго ўнікальнасці. Гэты строй адрозніваецца архаічнасцю, класічнай завершанасцю формаў адзення, арыгінальным жаночым галаўным уборам, выкарыстаннем багата афармленых дэкаратыўных тканін. Аснова жаночага гарнітура — кашуля, якую шылі з прамымі плечавымі ўстаўкамі і адкладным каўняром, вышытым чырвона-карычневым геаметрычным арнаментам. Ён кампанаваўся ў папярочныя палосы ў верхняй частцы плеч, манішчы і па боку каўняра.

Толькі для Маларытчыны характэрна геаметрычнае спалучэнне натуральных колераў: бела-шэрых ільну і пянькі, а таксама карычнева-чырвонай воўны. Фартух часта меў дэкаратыўна вышытыя завязкі. Падперазалі спадніцы тканым чырвоным поясам. Асаблівую выразнасць касцюму надаваў галаўны ўбор «плат», які толькі тут багата ўпрыгожвалі вышыўкай — зоркамі-разеткамі ў адным вуглу і ўзорыстымі палосамі па абодвух баках. Вытканыя на гэтых касцюмах арнаменты і ўзоры вызначаюцца багаццем і складанасцю. Аднак сама тэхналогія ткацтва «кажушком» яшчэ ў XX стагоддзі выйшла з ужытку сялян.

Беларуска-ўкраінскі праект прадугледжвае правядзенне майстар-класаў, падчас якіх маларыцкія майстрыхі падзеляцца досведам з суседзямі-ўкраінцамі. У школах двух раёнаў пройдуць розныя мерапрыемствы, накіраваныя на папулярызацыю народных строяў і звязаных з імі культурных традыцый, адбудуцца таксама экскурсіі ў музеі народнай творчасці Брэсцкай і Валынскай абласцей.

Дарэчы, ключавым элементам праекта стане правядзенне міжнароднага пленэру ткачоў у Маларыце і фальклорнага фэсту ў Ратна, дзе будуць прадстаўлены лепшыя праявы самабытнай культуры транспамежнага рэгіёна.

Раіса МАРЧУК

ЛіМ
Выходзіць з 1932 года
16 +
Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь,
грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі»,
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»
Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zvyazda.minsk.by
Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by
Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
аддзел «Кніжны свет» — 292-56-53
бухгалтэрыя — 287-18-14
Тэл./факс — 292-20-51

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.
Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ
Тэхнічны рэдактар, камп'ютарная вёрстка:
М. Ю. Мазоўка

Камп'ютарны набор:
А. І. Грамыка
Стыльрэдактар:
Н. А. Святлова
Нумар падпісаны ў друк
22.03.2018 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 1495
Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013
Заказ — 1020
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Аўтары паведамляюць прозвішча, імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, месца працы, адрас з індэксам. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.

© Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2017
© ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», 2017
© Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"», 2017

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 18011